

# Дзяржаўная палітыка знішчэння нацыянальнай памяці беларусаў 2020–2024

DANSK KULTUR-INSTITUT
ДАЦКІ КУЛЬТУРНЫ ІНСТЫТУТ

БЕЛАРУСКАЯ РАДА КУЛЬТУРЫ

# Змест

1. Барацьба з трыма слупамі нацыянальнай ідэнтычнасці: хаос ці наўмысная палітыка? 4

Нацыянальная сімволіка і беларуская мова пад забаронаю 4

Трансфармацыя ландшафту гістарычнай памяці 13

Высновы 19

2. Дзяржаўная стратэгія ў галіне гістарычнай адукацыі 22

Змест падручнікаў па гісторыі для агульнаадукацыйных установаў 22

Падручнікі для вышэйшых навучальных установаў і дзейнасць расійска-беларускай гістарычнай камісіі для “абароны гістарычнай праўды” 28

Высновы 35

3. Мілітарызацыя як новы кампанент адукацыйнага і выхаваўчага працэсу 37

Вайскова-“патрыятычныя” аб’яднанні: групы, класы, клубы і летнікі 37

Рэалізацыя выхаваўчых захадаў сіламі супрацоўнікаў сілавых ведамстваў, выязныя суды 43

Прасоўванне ідэалогіі “русского мира” і культу асобы Аляксандра Лукашэнкі 45

Высновы 48

Высновы і рэкамендацыі 50

**Мэта даследавання** – комплексна прааналізаваць палітыку ўладаў Беларусі ў справе (дэ)канструявання нацыянальнай гістарычнай памяці ў адукацыйнай сферы і сацыякультурнай прасторы (2020–2024).

Для дасягнення мэты вызначаныя наступныя **задачы:**

- ахарактарызаваць захады ўладаў Беларусі ў знішчэнні нацыянальнай сімволікі;
- прааналізаваць захады ў перайменаванні дзяржаўных установаў, змяненні ландшафтнай прасторы, ва ўсталяванні памятных знакаў;
- выявіць прычыны і заканамернасці ў вызначэнні "экстрэмісцкіх" твораў беларускай літаратуры;
- прааналізаваць змены, што адбыліся ў змесце школьных падручнікаў за 2020–2024 гг.;
- прааналізаваць змест новых падручнікаў па гісторыі для агульнаадукацыйных і вышэйшых навучальных установаў;
- выявіць заканамернасці ў рэпрэзентацыі гістарычнай мінуўшчыны ў навучальных дапаможніках і сувязь гэтых зменаў з сацыяльна-палітычным кантэкстам;
- вызначыць рэкамендацыі для рэалізацыі ў межах культурніцкіх і адукацыйных праектаў для супрацiву планамерным захадам рэжыму Лукашэнкі сцерці нацыянальную памяць беларусаў, пазбавіць нацыю культурнай ідэнтычнасці.

У даследаванні выкарыстаныя **метады:** параўнальны аналіз, дыскурс-аналіз зместу вучэбных дапаможнікаў, герменеўтычны метад, метад сацыяльнага канструктывізму.

**Эмпірычная база:**

- нарматыўна-прававыя акты органаў улады Рэспублікі Беларусь;
- навучальныя дапаможнікі па гісторыі Беларусі для агульнаадукацыйных і вышэйшых навучальных установаў;
- навуковыя манаграфіі і артыкулы;
- вынікі маніторынгу адкрытых крыніцаў (медыі, старонкі ў сацыяльных сетках органаў пракуратуры, унутраных справаў, іншых сілавых ведамстваў, установаў адукацыі ды інш.).

Даследаванне праведзенае вясною 2025 года.

# 1. Барацьба з трыма слупамі нацыянальнай ідэнтычнасці: хаос ці наўмысная палітыка?

## Нацыянальная сімволіка і беларуская мова пад забаронаю

Нацыянальная сімволіка цесна злучаная з нацыянальнай ідэяй. Сцяг, герб і гімн, прынятыя ды замацаваныя ў свядомасці насельніцтва, становяцца своеасаблівымі кодамі нацыі. Працэс стварэння нацыянальнай сімволікі большасці народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы пачаўся з “Вясны народаў” 1848–1849 гг., а яе замацаванне – у канцы Першай сусветнай вайны, падчас разбурэння Расійскай і Аўстра-Вугорскай імперыяў.

Разгледзеўшы комплекс сцягоў, які склаўся на этнічных беларускіх тэрыторыях у межах розных формаў гістарычнае дзяржаўнасці, а менавіта – Полацкай дзяржавы і Вялікага Княства Літоўскага (у 1569–1795 гг. разам з Польскім каралеўствам складала Рэч Паспалітую), даследнікі прыйшлі да наступных высноваў:

- у айчыннай вексілалогіі[1] дамінавалі чырвоныя і белыя харугвы або іх каляровыя, у тым ліку паласатыя – бел-чырвона-белыя – камбінацыі. Звязана гэта было найперш з уплывамі хрысціянскай культуры і глыбокімі геральдычнымі традыцыямі беларускага народу;
- замацаванне ў якасці дзяржаўнага сцяга ВКЛ чырвонай плахты са срэбным ці белым вершнікам Пагоні ў XVII–XVIII стст. прывяло да таго, што сярод вайсковых сцягоў усіх сацыяльных слаёў беларускага грамадства назіраўся паступовы пераход да дамінавання белага колеру, спалучэнне ў розных камбінацыях белага і чырвонага колераў;
- менавіта геральдычная і вексілалагічная спадчына ВКЛ, а таксама галоўныя прынцыпы сцягатварэння былі выкарыстаныя лідарамі беларускага нацыянальнага руху пры распрацоўванні бел-чырвона-белага сцяга падчас рыхтавання і абвяшчэння незалежнай беларускай дзяржавы ў пачатку XX ст.[2]

Пасля ўсталявання савецкай улады герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг на тэрыторыі Беларусі былі забароненыя. Яны вярнуліся толькі падчас Другой сусветнай вайны. Для сучасных уладаў гэты факт стаўся падставаю, каб абвінаваціць гістарычныя сімвалы ў нацызме. Нацыянальныя сімвалы выкарыстоўваліся калабарацыяністамі розных народаў, але ў еўрапейскіх краінах гэта не прывяло да іх адмены. Пасля вайны нацыянальныя сімвалы выкарыстоўваліся ў асяроддзі беларускай эміграцыі.

---

1 Вексілалогія (ад лац. vexillum ‘сцяг рымскага легіёну’) – спецыяльная гістарычная дысцыпліна, што вывучае сцягі, харугвы, штандары ды іншыя прадметы такога роду.

2 Бел-чырвона-белы. Сцяг. Нацыя. Ідэнтычнасць / Калектыў аўтараў. Andrei Yanushkevich Publishing, 2024. С. 67

25 жніўня 1991 г. Рэспубліка Беларусь прыняла герб Пагоню і бел-чырвона-белы сцяг у якасці дзяржаўных сімвалаў.

Аднак 14 траўня 1995 г. з ініцыятывы прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі быў праведзены рэферэндум. На разгляд выносіліся чатыры пытанні:

- наданне расійскай мове статусу другой дзяржаўнай;
- вяртанне да савецкіх дзяржаўных сімвалаў;
- падтрыманне курсу прэзідэнта на эканамічную інтэграцыю з Расіяй;
- наданне прэзідэнту права датэрмінова распускаць парламент.

На знак пратэсту супраць парушэння Канстытуцыі, якая не прадугледжвала магчымасці вылучаць такія пытанні на рэферэндум, дэпутаты апазіцыйных партыяў абвясцілі галадаванне. Іх збілі супрацоўнікі сілавых структураў і выдалілі з будынку парламенту. Лічыцца, што грамадзяне Беларусі падтрымалі ўсе прапановы, вынесеныя на рэферэндум. Аднак шматлікія парушэнні падчас яго правядзення ставяць пад сумнеў законнасць вынікаў.

Пасля таго як у жніўні 2020 г. сотні тыс. чалавек выйшлі на вуліцы беларускіх гарадоў пад бел-чырвона-белымі сцягамі, пратэстуючы супраць незаконнага захопу ўлады Лукашэнкам, выкарыстанне нацыянальнай сімволікі ў любой форме ў Беларусі забаранілі. Пры гэтым ідэалагічную базу для затрымання тых, хто наважыўся дэманстраваць сваю прыхільнасць нацыянальным сімвалам, стварылі толькі ў канцы 2022-га – 2023-м (гл. п. 2.1), а судовыя выракі прагучалі пасля пачатку пратэстаў. На падставе аналізу Хронікі парушэнняў правоў чалавека ў сферы культуры за 2021–2024 гг., апублікаванай Беларускім ПЭНам[3], можна вылучыць наступныя групы “злачынстваў”, як іх вызначыла цалкам залежная ад улады судовая сістэма Рэспублікі Беларусь.

**Публічнае выкарыстанне бел-чырвона-белага сцяга і герба Пагоня**

20 снежня 2021 г. у Полацку затрымалі Анатоля Каханчыка, які пафарбаваў дом у белы і чырвоны колеры, а на акне павесіў Пагоню[4]. Каханчыка двойчы пакаралі затрыманнем на содні паводле арт. 24.23 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях “Несанкцыянаванае пікетаванне”.

27 снежня 2021 г. чацвёрты раз запар асудзілі на 15 содняў Анатоля Шалковіча за выраб дома бел-чырвона-белых сцягоў[5].

На падставе арт. 24.23 Кодэксу аб адміністратыўных парушэннях у верасні 2023 г. жыхара Лучына Рагачоўскага раёну абвінавацілі ў несанкцыянаваным пікетаванні за бел-чырвона-белы сцяг на плоце каля ўласнага дому і аштрафавалі на Br 740 ($ 225)[6]. Жыхар Чэрвеня пацярпеў за тое, што ў 2020 г. вывешваў бел-чырвона-белы сцяг на даху свайго дому[7].

3 https://penbelarus.org/tag/hronika
4 https://penbelarus.org/2022/01/10/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury.html
5 https://penbelarus.org/2022/01/10/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury.html
6 https://penbelarus.org/2023/10/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-verasnya-2023-goda.html
7 https://penbelarus.org/2023/12/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-snezhnya-2023-goda.html

Жорстка пакаралі і тых, хто выкарыстаў нацыянальную сімволіку ў менш заўважных месцах. 10 содняў адміністратыўнага арышту прысудзілі студэнту Пінскага педагагічнага каледжу за тры бел-чырвона-белыя паласы на заплечніку[8]. Дзмітрыя Каваленку засудзілі на 15 содняў за "пікетаванне рамкаю з арнаментам на нумары аўтамабіля"[9]. Людзі атрымлівалі прысуды за бел-чырвона-белыя стужкі ці налепкі з Пагоняю на аўтах[10].

Падчас затрыманняў людзей жорстка збівалі, прымушалі выказваць знявагу да беларускіх нацыянальных сімвалаў. Гэтак, 13 кастрычніка 2022 г. супрацоўнікі міліцыі затрымалі магілёўскага таксоўца Дзяніса Клешчанку і запісалі "пакаяннае" відэа, у якім мужчына стаіць на бел-чырвона-белым сцягу, пад прымусам спявае песню расійскага гурта "Любэ" і топча кепку з Пагоняю[11].

Пратэстоўцы, якія не проста дэманстравалі нацыянальныя сімвалы, але і наносілі бел-чырвона-белыя выявы на электраслупы, дрэвы, лаўкі, прыпынкі транспарту, атрымалі пакаранне паводле арт. 341 Крымінальнага кодэксу "Знявага збудаванняў і псаванне маёмасці".

27 красавіка 2022 г. у судзе Маскоўскага раёну Брэсту разгледзелі крымінальную справу супраць Паўла Фалькоўскага, які балончыкам з фарбаю на адным з аўтобусных прыпынкаў напісаў "Жыве Беларусь!". Вырак – 3 месяцы зняволення[12]. На 6 месяцаў пазбаўлення волі засудзілі Пятра Пятрушу, які маляваў бела-чырвона-белыя сцягі ў розных месцах Мінску[13].

Хто атрымаў за дэманстрацыю нацыянальнай сімволікі найбольш жорсткія прысуды?

1) удзельнікі "злачыннай" групы. 14 верасня 2022 г. у Мінску затрымалі пяцярых чалавек, якія вывесілі бел-чырвона-белы сцяг і сцяг Украіны на 19-павярховым доме на вуліцы Лесі Украінкі[14]. Іх абвінавацілі паводле артыкулаў Крымінальнага кодэксу: ч. 1, 3 арт. 361-1 ("Стварэнне і ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні") і ч. 2 арт. 361-4 КК ("Спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці"). 6 красавіка 2023 г. суддзя Дзіна Кучук прызначыла мінчукам наступныя тэрміны:

- Дзянісу Воразаву – 5 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму;
- Вячаславу Панцюшэнку – 5 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму;
- Вользе Церах – 5 гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму;
- Уладзіміру Лавору – 4 гады і 9 месяцаў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму;
- Кацярыне Зарэцкай – 5 гадоў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

---

8 https://penbelarus.org/2022/02/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-studzenya-2022-goda.html
9 https://penbelarus.org/2022/10/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2022-goda.html
10 https://penbelarus.org/2023/03/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-28-lyutaga-2023-goda.html
11 https://penbelarus.org/2022/10/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2022-goda.html
12 https://penbelarus.org/2022/05/03/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-16-30-krasavika-2022-goda.html
13 https://penbelarus.org/2023/01/07/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-snezhnya-2022-goda.html
14 https://penbelarus.org/2022/09/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-verasnya-2022-goda.html

2) заснавальнікі крамаў беларускай сімволікі і сувеніраў. 11 траўня ў Мінскім гарадскім судзе агучылі вырак стваральніку крамы Symbal.by Паўлу Белавусу – 13 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Павел больш за 10 гадоў займаўся праектамі, якія прасоўваюць беларускую культуру і ідэю нацыянальнай ідэнтычнасці. Следчы камітэт заявіў, што Белавус "пад выглядам культурна-гістарычнага развіцця ў розных агульнадаступных сацыяльных сетках і на сайтах распаўсюджваў ідэі беларускага нацыяналізму, мэтай якіх была змена дзяржаўнай улады ў Беларусі"[15]. Паўла Белавуса прызналі вінаватым у парушэнні чатырох артыкулаў Крымінальнага кодэксу: арт. 342 "Арганізацыя і рыхтаванне дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх", арт. 356 "Здрада дзяржаве", арт. 361 "Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь", арт. 361.1 "Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім"[16].

У 2024 г. распачаліся крымінальныя справы супраць заснавальніка аршанскай крамы беларускіх сувеніраў і сімволікі "Цудоўная крама" Ігара Казмерчака і былога ўладальніка гродзенскай крамы "Адметнасць" Сяргея Верамеенкі[17]. 6 лютага 2025 г. затрымалі гаспадара гродзенскай крамы "Цудоўня" Андрэя Несцяровіча[18].

Улады Беларусі імкнуцца татальна кантраляваць віртуальную прастору. Затрыманні адбываліся нават за тое, чым раней ганарыліся. 26 жніўня 2022 г. стала вядома пра арышт бізнесоўца Вадзіма Слівінскага, які браў з сабой у вандроўкі бел-чырвона-белы сцяг і фатаграфаваўся з ім на Эльбрусе, а таксама ва Узбекістане і Кыргызстане[19].

Паводле арт. 24.23 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях людзей у асноўным затрымлівалі за бел-чырвона-белыя сцяжкі на аватарцы[20], фота з беларускаю нацыянальнаю сімволікаю[21], размяшчэнне на асабістых старонках герба Пагоня[22], падпіскі на "экстрэмісцкія" суполкі[23]. Размяшчэнне ў сацыяльных сетках экстрэмісцкіх матэрыялаў або падабайкі да іх ці рэпост, згодна з ч. 2 арт. 19.11 КаАП Рэспублікі Беларусь, караюцца штрафам да 30 базавых велічыняў, грамадскімі працамі або адміністратыўным арыштам да 15 содняў.

Жорсткія пакаранні паводле артыкулаў Крымінальнага кодэксу атрымалі тыя, хто дазволіў сабе крытыкаваць афіцыйную сімволіку. Гэтак,

---

15 https://penbelarus.org/2023/01/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-studzenya-2023-goda.html
16 https://penbelarus.org/2023/06/16/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-chervenya-2023-goda.html
17 https://penbelarus.org/2024/03/22/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-sakavika-2024-goda.html
18 https://penbelarus.org/2025/02/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-lyutaga-2025-goda.html
19 https://penbelarus.org/2022/09/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-zhniunya-2022-goda.html
20 https://penbelarus.org/2022/03/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-16-28-lyutaga-2022-goda.html
https://penbelarus.org/2022/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2022-goda.html
https://penbelarus.org/2023/11/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-kastrychnika-2023-goda.html
21 https://penbelarus.org/2022/09/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-zhniunya-2022-goda.html
https://penbelarus.org/2023/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2023-goda.html
https://penbelarus.org/2023/12/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-snezhnya-2023-goda.html
22 https://penbelarus.org/2023/04/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-sakavika-2023-goda.html
23 https://penbelarus.org/2023/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2023-goda.html
https://penbelarus.org/2024/02/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-studzenya-2024-goda.html

16 сакавіка 2023 г. паводле арт. 370 КК “Глумленне з дзяржаўных сімвалаў” засудзілі Паўла Дубава. У карпарацыйнай суполцы кампаніі грузаперавозаў ён пакінуў каментар, у якім сцвярджаў, што “наш сцяг – бел-чырвона-белы”, а дзяржаўны назваў “усходам сонца над балотам”. Вырак – 1,5 года пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму[24].

**Барацьба з выкарыстаннем нацыянальнай сімволікі ў прыватным жыцці грамадзянаў**

З пратаколаў пасяджэнняў судоў даведваемся, што апазіцыйнымі могуць быць тэлефоны[25], штодзённікі[26] і тэрмакубкі[27], абрусы і сурвэткі[28], стыкеры і кепкі[29], нават танк у гульні *World of Tanks*[30] ці калядная ялінка. Расправа з ялінкаю прайшла паспяхова. 23 снежня ў 2023 г. узброеныя прадстаўнікі спецпадраздзялення “Тайфун” уварваліся ў кватэру інжынера-праграміста ў Лідзе, дзе знайшлі ялінку, аздобленую шарамі з надпісам “Жыве Беларусь!”, паставілі гаспадара на калені, а ялінку кінулі на падлогу[31].

Пастановы судоў таксама дазваляюць даведацца, колькі ў Беларусі каштуе:

- пафарбаваць у нацыянальныя колеры альтанку на падворку - Br 2000 ($ 610)[32]
- мець бел-чырвона-белы катафот на ровары – Br 555 ($ 175)[33]
- выйсці надвор у белых шкарпэтках з чырвонаю паласою – Br 2320 (каля $ 906 долараў)[34]
- размясціць здымак з бел-чырвона-белым сцягам у сацыяльнай сетцы – Br 3700 ($ 1117)[35]
- размясціць відэаролік з бел-чырвона-белаю сімволікай у сацыяльнай сетцы –Br 4000 ($ 1222)[36]
- пазнаёміцца з дзяўчынай у Tinder у майцы з Пагоняю –Br 3330 ($ 1000)[37]
- зрабіць бел-чырвона-белы манікюр – Br 3700 ($ 1465)[38]
- насіць на пашпарце вокладку з гербам Пагоня – Br 2220 ($ 880)[39]

Выкарыстоўванне Пагоні менавіта на вокладцы пашпарта – пашыраная форма “злачынства”, бо шмат з тых, хто ў 2020-м выйшаў на мірныя дэманстрацыі, атрымалі свае першыя пашпарты менавіта з гэтаю сімволікаю. Калі падчас судовага пасяджэння праваабаронца Алесь Рамановіч нагадаў

24 https://penbelarus.org/2023/04/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-sakavika-2023-goda.html
25 https://penbelarus.org/2023/06/16/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-chervenya-2023-goda.html
26 https://penbelarus.org/2022/10/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2022-goda.html
27 https://penbelarus.org/2023/07/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-chervenya-2023-goda.html
28 https://penbelarus.org/2024/03/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-29-lyutaga-2024-goda.html
29 https://penbelarus.org/2022/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2022-goda.html
30 https://penbelarus.org/2023/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2023-goda.html
31 https://penbelarus.org/2024/01/05/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-snezhnya-2023-goda.html
32 https://penbelarus.org/2024/12/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-snezhnya-2024-goda.html
33 https://penbelarus.org/2023/11/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-kastrychnika-2023-goda.html
34 https://www.bbc.com/russian/features-57000173
35 https://penbelarus.org/2024/01/05/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-snezhnya-2023-goda.html
36 https://penbelarus.org/2024/04/19/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-krasavika-2024-goda.html
37 https://penbelarus.org/2023/11/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-kastrychnika-2023-goda.html
38 https://penbelarus.org/2023/09/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-verasnya-2023-goda.html
39 https://penbelarus.org/2023/10/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-verasnya-2023-goda.html

суддзі, што герб Пагоня прызнаны ў Беларусі гістарычна-культурнаю каштоўнасцю, то пачуў у адказ: “А вы ведалі, што Пагоня выкарыстоўваецца як сімвал пратэсту?”[40] Гэта ўся доказная база, на якую абапіраюцца суддзі ў барацьбе з нацыянальнымі сімваламі.

Дзе праходзіць мяжа, якая аддзяляе публічнае жыццё чалавека ад той інтымнай зоны, куды староннім уваход забаронены? У сучаснай Беларусі яна адсутнічае. Паступова ўлады дабраліся да цела чалавека. У 2023 г. пачаліся затрыманні за “экстрэмісцкія” татуяванні (найчасцей, з выяваю Пагоні): у лютым[41], траўні[42], ліпені[43], жніўні[44].

Найбольш цынічным выглядае затрыманне ў мінскім шпіталі №5 пацыента з тату герба Пагоня на лытцы, які звярнуўся ў медычную ўстанову па дапамогу. Яго абвінавацілі ў пікетаванні татуяваннем і прызначылі 7 содняў адміністратыўнага арышту[45].

Кожнае затрыманне – гвалт і здзек з чалавечай годнасці. 5 верасня 2022 г. у Мінску затрымалі вакаліста панк-гурта *Hate to State* Віктара Жаркевіча. Яго моцна збілі, зламалі аб галаву патэльню і прымусілі несці дзверы, вырваныя з лядоўні, бо на ёй былі пратэсныя стыкеры, а на галаву надзелі будаўнічую каску з налепкаю з Пагоняю. Віктар памёр 22 верасня 2024 г. Не вытрымала сэрца[46].

На жаль, менавіта скаргі “пільных грамадзянаў” не аднойчы былі прычынаю грубага ўмяшальніцтва прадстаўнікоў сілавых структураў у прыватнае жыццё чалавека. Данос як форма ўзаемадзеяння грамадзянаў і прадстаўнікоў органаў улады актыўна заахвочваецца ў сучаснай Беларусі. Даносчыкі добра ведаюць, што іхныя апаненты зазнаюць катаванні, але не спыняюцца. Што гэта – форма грамадскага супрацьстаяння ці спосаб развязаць асабістыя праблемы? Мы толькі пачынаем шукаць адказ на гэтае пытанне. І сімвалічна, што ў сакавіку 2024 г. плыўца Дзмітрыя Шчэмера затрымалі за чахол з надпісам “Pray for Belarus” (“Маліцеся за Беларусь”)[47].

### Абмежаванне прасторы беларускай мовы

28 ліпеня 2022 г. падчас круглага стала, зарганізаванага ў Мінску праўладным Саюзам пісьменнікаў Беларусі, намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі заявіў: *“Недастатковае разуменне таго, што кніга – значна больш магутная зброя, чым ракеты і танкі, прыводзіць да таго, што даводзіцца выкарыстоўваць ракеты і танкі”*[48].

---

40 https://penbelarus.org/2022/05/03/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-16-30-krasavika-2022-goda.html

41 https://penbelarus.org/2023/02/17/hronika-parushennya-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-lyutaga-2023-goda.html

42 https://penbelarus.org/2023/05/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-traunya-2023-goda.html

43 https://penbelarus.org/2023/07/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-lipenya-2023-goda.html https://penbelarus.org/2023/08/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-lipenya-2023-goda.html

44 https://penbelarus.org/2023/09/02/hronika-parushennya%d1%9e-pravo%d1%9e-chalaveka-%d1%9e-sfery-kultury-15-31-zhni%d1%9enya-2023-goda.html

45 https://penbelarus.org/2024/06/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-chervenya-2024-goda.html

46 Памёр легенда беларускага панка Віктар «Мао» Жаркевіч. Губазікаўцы прымушалі яго несці з сабой дзверы ад халадзільніка / Наша Ніва, 23.09.2024: https://nashaniva.com/351891

47 https://penbelarus.org/2024/03/22/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-sakavika-2024-goda.html

48 https://penbelarus.org/2022/08/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-lipenya-2022-goda.html

Вайсковая тэрміналогія ў гэтым выпадку цалкам адпавядае зместу. Урад абʼявіў вайну беларускім кнігам і іх выдаўцамі. Хроніка падзеяў:

- Снежань 2021. Выйшаў апошні нумар газеты “Наша слова”, Вярхоўны Суд зліквідаваў яе заснавальніка – Таварыства беларускай мовы[49].
- Студзень 2022. Выданне “Наша Ніва” прызналі “экстрэмісцкім фармаваннем”[50].
- Красавік 2022. Міністэрства інфармацыі прыпыніла дзейнасць выдавецтва “Галіяфы” (выданне кніг сучасных аўтараў, дзіцячае літаратуры, кніг пра мастацтва)[51].
- Травень 2022. Прыпыніла працу выдавецтва “Лімарыус” (выданне мемуараў, архіўных матэрыялаў, гістарычных даследаванняў)[52].
- Ліпень 2022. За “распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў” заблакавалі сайт беларускага часопісу *Arche*[53].
- Студзень 2023. Прыпыніла працу ў Беларусі выдавецтва “Янушкевіч”[54].
- Студзень 2023. Спыніла дзейнасць выдавецтва “Кнігазбор”[55].
- Травень 2023. Зліквідавалі выдавецтва “Зміцер Колас”[56].
- Ліпень 2023. Заблакавалі інтэрнэт-бібліятэку беларускай літаратуры Kamunikat.org[57].
- Снежань 2023. Зліквідавалі выдавецкі дом “Віта” (выпусціў кнігу для сексуальнай асветы дзяцей)[58].
- Студзень 2024. Перастаў выходзіць літаратурны часопіс “Дзеяслоў”[59].
- Кастрычнік 2024. У Гродне адбылося судовае пасяджэнне паводле справы выдавецтва “Літара” (выданне кніг па гісторыі Беларусі), Выдаўцоў судзілі за “незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць”, што пагражае пазбаўленнем ліцэнзіі[60].

Прастора беларускае мовы звузілася і ў прамым сэнсе слова.

14 верасня 2023 г. кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Ігар Сергеенка паведаміў, што Лукашэнка даручыў ураду да канца года спыніць выкарыстанне лацінкі ў назвах вуліцаў і геаграфічных абʼектаў[61]. Пасля чаго надпісы на лацінцы ў мінскім метро змянілі на расійскамоўныя[62]. На ўказальніках на дарогах зніклі назвы гарадоў, зробленыя лацінскімі літарамі па-беларуску[63].

---

49 https://penbelarus.org/2022/01/10/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury.html снежань 2021
50 https://penbelarus.org/2022/02/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-studzenya-2022-goda.html
51 https://penbelarus.org/2022/09/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-zhniunya-2022-goda.html
52 https://penbelarus.org/2022/09/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-zhniunya-2022-goda.html
53 https://penbelarus.org/2022/07/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-lipenya-2022-goda.html
54 https://penbelarus.org/2023/01/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-studzenya-2023-goda.html
55 https://penbelarus.org/2023/02/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-studzenya-2023-goda.html
56 https://penbelarus.org/2023/05/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-traunya-2023-goda.html
57 https://penbelarus.org/2023/08/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-lipenya-2023-goda.html
58 https://penbelarus.org/2024/01/05/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-snezhnya-2023-goda.html
59 https://penbelarus.org/2024/01/05/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-snezhnya-2023-goda.html
60 https://penbelarus.org/2024/10/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2024-goda.html
61 https://penbelarus.org/2023/09/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-verasnya-2023-goda.html
62 https://nashaniva.com/327268
63 https://penbelarus.org/2023/12/04/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-listapada-2023-goda.html

Шыльды і ўказальнікі з беларускаю лацінкаю прыбралі з гарадской прасторы Гродна[64].

Відавочна, улады ўспрымаюць беларускую лацінку як уплыў заходняй культуры, небяспеку для збудаваных імі хісткіх гістарычных канструкцыяў пад уплывам ідэяў "русского мира".

Як высвятляецца, не толькі лацінка перашкаджае існаванню рэжыму Лукашэнкі. 26 лютага 2021 г. у Мінску затрымалі 15 жанчын. Пенсіянеркі чыталі ў электрычцы беларускія кнігі – Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Віткі, вершы Янкі Купалы. І хоць гэтыя кнігі не ўваходзяць у спісы забароненых у Беларусі, частка затрыманых пенсіянерак атрымала буйныя штрафы, а Галіна Гулянкова – арышт на 20 содняў[65].

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь размясціла на сваім сайце два пералікі:

- Спіс друкаваных выданняў, якія змяшчаюць інфармацыйныя паведамленні і (або) матэрыялы, распаўсюд якіх здольны нашкодзіць нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь[66] (на студзень 2025 г. у ім былі 65 кніг[67]);
- Спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, у якім больш за 1500 старонак[68]. Сярод іх – кнігі, прысвечаныя гісторыі Беларусі: "Айчына: Маляўнічая гісторыя. Ад Рагнеды да Касцюшкі" Уладзіміра Арлова ці "Краткий курс истории Беларуси IX–XXI вв" Анатоля Тараса. Ёсць у спісе творы Ларысы Геніюш і Наталлі Арсенневай, якіх так і не прызнала сваймі савецкая ўлада. Не прыняў іх і рэжым Лукашэнкі. "Экстрэмісцкімі" прызнаныя кнігі апанентаў рэжыму: Паўла Севярынца, Уладзіміра Някляева, Альгерда Бахарэвіча ды іншых.

Падрабязны аналіз абодвух спісаў – прадмет асобнага даследавання. Нас цікавіць, хто з класікаў беларускай літаратуры падаецца чыноўнікам найбольш небяспечным. І гэта:

- **Янка Купала**. 10 лістапада 2022 г. вітанне "Жыве Беларусь", якое ёсць цытатаю з ягонага вершу, напісанага ў 1905–1907 гг., залучанае Міністэрствам унутраных справаў у пералік нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі. За выкарыстанне лозунгу наступае крымінальная адказнасць паводле арт. 341-1 КК РБ (штраф, арышт, абмежаванне волі да 3 гадоў або пазбаўленне волі да 4 гадоў)[69]
- **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**. 17 жніўня 2023 г. ягоныя тэксты, напісаныя падчас антырасійскага паўстання 1863 г., "Плывуць вятры"

64 https://penbelarus.org/2023/10/16/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2023-goda.html

65 Под Минском пенсионерок задержали в электричке за чтение книг на белорусском языке. Одну из них арестовали на сутки, других оштрафовали / Настояее время, 02.03.2021: https://www.currenttime.tv/a/belarus-train-pensioners-detention/31130007.html

66 http://mininform.gov.by/documents/spisok-pechatnykh-izdaniy-soderzhashchikh-informatsionnye-soobshcheniya-i-ili-materialy-rasprostrane/

67 https://penbelarus.org/2025/02/03/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-studzenya-2025-goda.html

68 http://mininform.gov.by/documents/respublikanskiy-spisok-ekstremistskikh-materialov/

69 https://penbelarus.org/2022/11/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-listapada-2022-goda.html

і “Гутарка старога дзеда”, былі прызнаныя “экстрэмісцкімі”[70]. Трэба ўдакладніць:
Па-першае, названыя творы толькі прыпісваюцца Дунін-Марцінкевічу[71]. Доказу ягонага аўтарства няма. Па-другое, “злачынства” тэкстаў палягае ў антырасійскай скіраванасці. Калі тэма не атрымала развіцця ў спісе, гэта значыць, што яго складальнікі не ведаюць, дзе шукаць працяг. Не будзем ім падказваць

- **Уладзімір Караткевіч**. 3 верасня 2023 г. раман “Каласы пад сярпом тваім”, прысвечаны падзеям напярэдадні паўстання 1863 г., замянілі ў школьнай праграме на “Чорны замак Альшанскі”[72]
- **Вацлаў Ластоўскі**. 6 траўня 2024 г. на падставе заявы пракуратуры Мінску “экстрэмісцкімі матэрыяламі” прызналі ягоныя выбраныя творы, выдадзеныя ў межах праекту “Беларускі кнігазбор”[73]

Палітычны дзеяч, пісьменнік, гісторык Вацлаў Ластоўскі (1883–1938) — адзіны аўтар, чыю творчасць закляймілі двойчы. В. Ластоўскі адмаўляў канцэпцыю адзінства гістарычных лёсаў Расіі і Беларусі, звяртаў увагу на неабходнасць больш цеснага збліжэння з балтыйскімі суседзямі. 14 кастрычніка 2024 г. суд Баранавіцкага раёну і Баранавічаў яшчэ раз прызнаў “экстрэмісцкімі матэрыяламі” ягоныя выбраныя творы[74].

У чэрвені 2024 г. улады ўпершыню пацвердзілі, што знішчаюць выданні, якія абвяшчаюць “экстрэмісцкімі”[75]. 24 верасня 2024 г. стала вядома, што ў Магілёве ў бібліятэцы калоніі № 15 на загад адміністрацыі спалілі кнігі на беларускай мове, а таксама раманы Джорджа Оруэла “Ферма” і “1984”[76]. Свой дзень памяці спаленых кніг з’явіўся і ў Беларусі[77].

Але паліць кнігі пачалі не ў нацысцкай Нямеччыне, у гэтай з’явы глыбейшыя карані. Адным з першых, хто аддаў такі загад, у 221 годзе да н. э., быў кітайскі імператар Цынь Шыхуандзі. Ён быў перакананы, што ідэі з кніг пагражаюць ягонаму плану стварыць ідэальную кітайскую дзяржаву. Іронія ў тым, што ягоную дынастыю зрынулі непісьменныя сяляне. Не існуе палітычнага рэжыму ці асобы, якім знішчэнне кніг дапамагло б уладарыць вечна. Нават калі беларускія чыноўнікі не ведаюць пра гэта.

## Трансфармацыя ландшафту гістарычнай памяці

70 https://penbelarus.org/2023/09/02/hronika-parushennya%d1%9e-pravo%d1%9e-chalaveka-%d1%9e-sfery-kultury-15-31-zhni%d1%9enya-2023-goda.html

71 Кісялёў Г. Смак беларушчыны. Мінск: Лімарыус, 2013.

72 Са школьнай праграмы прыбралі раман «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча / Зеркало, 05.09.2023: https://news.zerkalo.io/cellar/48155.html

73 https://penbelarus.org/2024/05/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-traunya-2024-goda.html

74 https://penbelarus.org/2024/10/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2024-goda.html

75 https://penbelarus.org/2024/06/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-chervenya-2024-goda.html

76 https://penbelarus.org/2024/10/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-verasnya-2024-goda.html

77 10 траўня 1933 года ў нацысцкай Германіі быў абвешчаны «Святам кастра». Студэнты ў нацысцкай форме палілі кнігі пад лозунгам «Прэч негерманскі дух!».

Назвы вуліцаў і плошчаў, манументы і помнікі ствараюць так званы мемаратыўны ландшафт, які ёсць важным элементам у падтрыманні агульнага гістарычнага вобразу мінулага. Нягледзячы на здабытую ў 1991 г. незалежнасць, у Беларусі не адбылося крытычнага пераасэнсавання мемаратыўнай прасторы гарадоў, яе дэкамунізацыі і дэкаланізацыі.

Яшчэ ў XIX ст., пасля далучэння беларускіх земляў да Расійскай імперыі, пачаўся працэс замены гарадскіх тапонімаў, які значна паскорыўся ў 1860-я гг. пасля здушэння паўстання 1863–1864 гг. Паступова гарадская тапаніміка Беларусі робіцца адпаведнаю расійскай культурнай традыцыі (вуліцы Кутузаўская, Аляксандраўская, Пушкінская, Серпухаўская)[78].

У рэвалюцыйным вогнішчы пачатку XX ст. Расійская імперыя трансфармавалася ў СССР (1922). Змена ідэалагічнага ладу на сацыялістычны не прыпыніла змены гарадской прасторы, а, наадварот, паскорыла. У першую чаргу пацярпелі ўладанні шляхты, якім не знайшлося месца ў пралетарскай дзяржаве. У найлепшым выпадку шляхецкія сядзібы змянялі функцыянальную прыналежнасць (пад школу, кантору калгасу), у найгоршым – ператвараліся ў руіны.

Падчас Другой сусветнай вайны беларускія гарады спазналі ўвесь цяжар ваеннага часу. Тым не менш комплексы гістарычнай забудовы шмат якіх гарадскіх цэнтраў маглі б дачакацца аднаўлення. Аднак у пасляваенны перыяд назіраўся працэс перакройвання буйных беларускіх гарадоў: з’явіліся вуліцы, названыя ў гонар рускіх пісьменнікаў, военачальнікаў, дзеячаў рэвалюцыі, ніяк не звязаных з Беларуссю (Чэхава, Васняцова, Нахімава, Калініна, Пляханава). У 1960–1970-я пашырыўся комплекс назваў, звязаных з героямі Вялікай Айчыннай вайны. На працягу 1990-х, у адрозненне ад суседніх Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы і Украіны, у Беларусі не адбылося крытычнага пераасэнсавання гістарычнага багажу, назапашанага за больш як два стагоддзі, калі беларускія землі былі ў складзе Расійскай імперыі і СССР[79].

У 2023 г. было праведзенае даследаванне мемарыяльных аб’ектаў 5 абласных цэнтраў Беларусі: Брэсту, Віцебску, Гомля, Гродна, Магілёва. Для вызначэння прыналежнасці аб’ектаў да пэўнай гістарычна-культурнай традыцыі аўтары вылучылі наступныя параметры:

1. які гістарычны перыяд адлюстроўваецца,
2. якой тэме прысвечаны,
3. чыю памяць рэпрэзентуе (дзяржавы, нацыі, супольнасці)[80].

Даследнікі прыйшлі да высновы, што колькасць месцаў памяці, якія рэпрэзентуюць гістарычныя падзеі да XIX ст., у гарадах Беларусі нешматлікая. Яны губляюцца ў гарадской прасторы на фоне дамінавання аб’ектаў XX ст.

---

78 Гардзееў, Ю. Урбананімічны дыскурс у постсавецкай Беларусі. Acta Baltico Slavica. Polska – Litwa – Białoruś. Historia, która dzieli i łączy. 2017. Vol. 41. С. 212-250.

79 Трансфармацыя гарадской прасторы ў Беларусі праз прызму (пост?)каланіяльнасці: кейс галоўнай плошчы Магілёва / Менская ўрбаністычная платформа, 02.07.2024: https://www.mienskurban.space/chasopis/transfarmacyja-haradskoj-prastory-u-bielarusi-praz-pryzmu-postkalanijalnasci-kiejs-halounaj-ploscy-mahiliova

80 Памяць у ландшафце беларускіх гарадоў: помнікі і іншыя мемарыяльныя аб’екты абласных цэнтраў Беларусі / Андрэй Мастыка, Андрэй Казакевіч, Уршуля Кацінская / Інстытут «Палітычная сфера» 2024: https://palityka.org/2024/01/pamjac-u-landshafcje-bjelaruskikh-haradou/

Што датычыць эпохі XIX ст., то тут назіраецца яўна каланіяльны характар мемарыяльнай прасторы, якая рэпрэзентуе культуру праз постаці пераважна расійскіх дзеячаў. У той жа час у Беларусі вельмі мала манументаў, якія б ушаноўвалі памяць агульнанацыянальных дзеячаў і творцаў[81].

Геральдычная рада “Пагоня” даследавала тапаніміку сталіцы (2024). Высветлілася, што ў гонар вайскоўцаў, герояў Савецкага Саюзу ў Мінску названыя ўдвая больш вуліцаў, чымся ў гонар беларускіх навукоўцаў і культурніцкіх дзеячаў. Расійскія і савецкія вайскоўцы далі імёны 114 вуліцам, расійскія пісьменнікі, мастакі і навукоўцы – 110, а бальшавікі і савецкія дзеячы – 73. Тапанімічны ландшафт Мінску сапраўды нагадвае ландшафт савецкага гарнізоннага мястэчка[82]. Згодна з рэкамендацыямі ў даследаванні, мінімум 538 аб’ектаў сталіцы патрабуюць перайменавання.

Аналагічная сітуацыя ў Гродне. Сярод 285 аб’ектаў, перайменаванне якіх рада прызнала пажаданым, 181 не мае дачынення да гісторыі Беларусі[83].

Такім чынам, асноваю мемарыяльнай прасторы беларускіх гарадоў XX стагоддзя застаецца памяць пра Вялікую Айчынную вайну, што ўвасабляецца ў назвах вуліцаў, помніках і манументах. Галоўны пафас, які нясуць гэтыя аб’екты, – гераічнасць і самаахвярнасць. Што датычыць іншых сфераў савецкага мінулага, то назіраецца перавага сілавога дзяржаўнага складніку: мемарыяльныя знакі, прысвечаныя міліцыі, органам КДБ/НКУС, арміі і авіяцыі. У той жа час помнікі ахвярам савецкіх рэпрэсіяў існуюць не ўва ўсіх абласных цэнтрах. Усталяваныя яны звычайна з грамадскай ініцыятывы і за кошт супольнасці, таму на гэтую тэму няма буйных мемарыялаў.

**Дзяржаўны вандалізм у дачыненні памятных мясцінаў**

Сапраўдны наступ на месцы памяці ахвяраў камунізму ў Беларусі адбыўся ў 2022 г., калі былі знішчаныя сведчанні не менш як пра 11 пахаванняў, з іх 9 у Гродзенскай вобласці[84]. Гэта сур’ёзны ўдар па гістарычнай памяці беларусаў, бо ў 2011 г. даследнікі налічылі на Гродзеншчыне 34 такія мемарыяльныя знакі[85].

26 жніўня 2022 г. пры ўдзеле міліцыі і прадстаўнікоў мясцовых уладаў былі зруйнаваныя могілкі жаўнераў Арміі Краёвай у Суркантах Воранаўскага раёну. Дарогу да месца, дзе ўчынілі вандалізм, перакрыла міліцыя, а мясцовым жыхарам, якія спрабавалі зафіксаваць злачынства, супрацоўнікі міліцыі пагражалі зняволеннем[86].

На працягу 2023–2024 гг. мясцовыя ўлады метадычна знішчалі ўспаміны пра значныя падзеі беларускай гісторыі з XVIII да XX стст.

81 Там жа. С. 26-29.

82 «Минск напоминает советский гарнизонный городок». Как предлагают заменить царские и коммунистические названия в столице? / Наша Ніва, 07.11.2024: https://nashaniva.com/ru/354893

83 Исследование выявило в Гродно 285 враждебных Беларуси названий улиц. Вот как предлагают их переименовать / Наша Ніва, 28.02.2025: https://nashaniva.com/ru/362704

84 Беларускае гістарычнае таварыства Польшчы асуджае знішчэнне магіл польскіх салдат у Беларусі / PolskieRadio, 11.07.2022: https://www.polskieradio.pl/396/7817/Artykul/2998149

85 Месцы памяці ахвяраў камунізму ў Беларусі / Анна Камінскі (Рэд.), Фонд даследавання камуністычных дыктатур, 2011: https://www.bundesstiftung-aufarbeitung.de/sites/default/files/shop/belarusgof.pdf, с. 145-184.

86 https://penbelarus.org/2022/09/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-zhniunya-2022-goda.html

З муроў Новага замку ў Гродне знікла мемарыяльная дошка, прысвечаная Тадэвушу Касцюшку і паўстанню 1794 г.[87] З будынку гродзенскага чыгуначнага вакзалу – памятны знак паўстанцам 1863-га. Замест яго з'явілася дошка, прысвечаная савецкім падпольшчыкам часу Другой сусветнай вайны[88].

У 2023 г. у Гродне прыбралі з вуліцаў турыстычныя стэнды, прысвечаныя жыццю пісьменніцы Элізы Ажэшкі, усталяваныя да 180-годдзя пісьменніцы[89].

28 лютага 2023 г. стала вядома, што ў мястэчку Солы Смаргонскага раёну ў касцёле Маці Божай Ружанцовай зафарбавалі фрэску "Цуд над Віслаю", што адлюстроўвала Варшаўскую бітву, у выніку якой Польшча спыніла наступ Чырвонай арміі падчас савецка-польскай вайны 1919–1921 гг.[90] З Пакроўскага сабору ў Гродне прыбралі абразы святых пакутнікаў Уладзіміра, мітрапаліта Кіеўскага (закатаваны камуністамі ў 1918-м) і Веньяміна, мітрапаліта Петраградскага (расстралянага ў 1922-м). Святыя былі намаляваныя ў момант свайго пакутніцтва, а іхныя забойцы – ва ўніформе чырвонаармейцаў і чэкістаў[91].

У найбольшай ступені пацярпелі памятныя знакі, прысвечаныя ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў. 30 сакавіка 2023 г. у Зэльве дэмантавалі помнік паэтцы, вязніцы ГУЛАГу Ларысе Геніюш. У жніўні 2023-га на вайсковых могілках у Гродне знялі таблічку з надпісам на беларускай мове "Жыхарам Гродна, афіцэрам Войска Польскага, расстраляным у сталінскіх лагерах". Амаль адначасова ў парку Чалюскінцаў у Мінску знік надпіс па-беларуску з помніку ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў[92].

26 траўня 2024 г. у месцы сталінскіх расстрэлаў – Курапатах – знеслі крыжы з надпісамі "Беларускім сялянам", "Беларускай інтэлігенцыі",



Фрэска "Цуд над Віслай" у Солах да зафарбоўвання.

Фота: katolik.life

87 https://penbelarus.org/2024/05/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-krasavika-2024-goda.html
88 https://penbelarus.org/2023/08/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-lipenya-2023-goda.html
89 https://penbelarus.org/2023/09/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-verasnya-2023-goda.html
90 https://penbelarus.org/2023/03/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-28-lyutaga-2023-goda.html
91 https://penbelarus.org/2023/10/16/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2023-goda.html
92 https://penbelarus.org/2023/08/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-zhniunya-2023-goda.html

а таксама імянныя крыжы на польскай мове[93]. 8 верасня 2024 г. стала вядома пра вандалізм у месцы масавых расстрэлаў часу СССР каля вёскі Хайсы ў Віцебскім раёне, дзе былі знішчаныя 26 крыжоў, а таксама ўказальнікі да магілаў і шыльды з інфармацыяй пра расстрэлы[94]. 2 лістапада 2024 г. з Лошыцкага парку ў Мінску знік крыж, прысвечаны ахвярам камуністычных рэпрэсіяў[95].

Разам са знішчэннем памятных знакаў адбываецца іх зневажанне.

23 кастрычніка 2022 г. з'явілася інфармацыя, што ў Лідзе на могілках пашкоджаны помнік жаўнерам Войска Польскага, якія загінулі ў Нёманскай бітве (1920). Акту вандалізму папярэднічаў данос у "СБ. Беларусь сегодня". Прапагандыстка Людміла Гладкая абуралася, што на помніку ўдзельнікам Арміі Краёвай напісана "загінулі за Радзіму ў 1919–1920 гг.": "За радзіму, разумееце? То бок ужо тады Заходнюю Беларусь польскія акупанты лічылі сваёй"[96].

Найбольш не пашанцавала месцу памяці выбітнага палітыка, гісторыка і пісьменніка Вацлава Ластоўскага. Знакамітага дзеяча беларускага нацыянальнага адраджэння расстралялі ў 1938 г. Крыж, усталяваны ў ягоны гонар ва ўрочышчы Курапаты, быў апаганены тройчы: у ліпені 2022 г.[97], красавіку[98] і кастрычніку 2023 г.[99]

**Новыя імёны ўстановаў адукацыі**

Каманда экспертаў *East Stratcom*[100] прыйшла да высновы, што пасля 2020 г. сотні школаў па ўсёй Беларусі былі перайменаваныя ў гонар савецкіх герояў[101]. Праўда, лічбы не пацверджаныя. У якасці прыкладу прыводзяць толькі брэсцкую СШ № 35, якая атрымала імя Канстанціна Ракасоўскага. Аднак у той жа дзень 2023 г. яшчэ пяці школам гораду прысвоілі імёны герояў Другой сусветнай вайны і аднаго ўдзельніка савецкага кантынгенту ў Афганістане[102]. Рэгулярная фіксацыя прысваення новых імёнаў агульнаадукацыйным установам адсутнічае і ў "Хроніцы парушэнняў правоў чалавека ў сферы культуры" Беларускага ПЭНу[103].

Спроба разабрацца з гэтым пытаннем прыводзіць да высновы: мясцовыя ўлады актуалізавалі ўказ за 24.03.2016 г. "Аб увекавечанні памяці загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці ахвяраў войнаў" і актыўна далучыліся да кампаніі надання агульнаадукацыйным установам Беларусі імёнаў герояў Другой сусветнай вайны і савецкіх воінаў-інтэрнацыяналістаў.

---

93 https://penbelarus.org/2024/06/04/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-traunya-2024-goda.html

94 https://penbelarus.org/2024/09/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-verasnya-2024-goda.html

95 https://penbelarus.org/2024/11/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-listapada-2024-goda.html

96 https://penbelarus.org/2022/11/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-kastrychnika-2022-goda.html

97 https://penbelarus.org/2022/08/01/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-31-lipenya-2022-goda.html

98 https://penbelarus.org/2023/05/02/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-15-30-krasavika-2023-goda.html

99 https://penbelarus.org/2023/10/16/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-kastrychnika-2023-goda.html

100 https://euvsdisinfo.eu/by/about-by

101 17 верасня ў лукашэнкаўскай Беларусі: мілітарысцкая рыторыка ў стылі СССР і дэманізацыя Польшчы / EUvsDisinfo, 16.09.2023: https://euvsdisinfo.eu/by/17-%D0%B2%D0%B5%D1%80%D0%B0%D1%81%D0%BD%D1%8F-%D1%9E-%D0%BB%D1%83%D0%BA%D0%B0%D1%88%D1%8D%D0%BD%D0%BA%D0%B0%D1%9E%D1%81%D0%BA%D0%B0%D0%B9-%D0%B1%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D1%96-%D0%BC%D1%96/

102 ТГ канал "Любимый Брест", 22.08.2023: https://t.me/brestgik/2727

103 https://penbelarus.org/tag/hronika

У прыватнасці ў канцы 2020 г. Віцебскі раённы выканаўчы камітэт надаў адначасова шасці школам раёну імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны[104]. Імя героя Савецкага Саюзу Захара Лышчэні вярнулі Ямінскай сярэдняй школе Любанскага раёну Мінскай вобласці[105]. Сталічнай СШ № 205 прысвоілі імя героя Другой сусветнай вайны, а таксама ўдзельніка аперацыяў савецкіх войскаў у Егіпце (1970) і Эфіопіі (1977) Рыгора Дольнікава[106]. Слонімскай СШ № 10 прысвоілі імя былога старшыні Слонімскага гарвыканкаму (1963–1975) Васіля Пеляніцына[107]. Нарэшце Ліцэю БДУ надалі імя заснавальніка Усерасійскай надзвычайнай камісіі, супрацоўнікі якой знішчылі тысячы беларусаў – праціўнікаў савецкай улады, Феліксa Дзяржынскага[108].

Разам з тым сістэматычнага адсочвання працэсу надання школам новых імёнаў не існуе. Фіксуюцца толькі прыклады перайменавання. Гэтак, адна з найстарэйшых установаў адукацыі Беларусі (дзейнічае з 1804 г.) – гімназія  № 1 у Свіслачы – страціла імя нацыянальнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага. Цяпер яна носіць імя падпольшчыцы часу Другой сусветнай вайны Праскоўі Васіленкі[109].

Імя Кастуся Каліноўскага аказалася невыносным і для чыноўнікаў Брэсцкай вобласці. У Кобрыне раённы савет дэпутатаў надаў вуліцы, раней названай у ягоны гонар, імя сакратара ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (1965–1980) Пятра Машэрава[110].

**Дзейнасць Беларускай праваслаўнай царквы**

Праваслаўная царква мае значны ўплыў на фармаванне комплексу мемарыяльных аб’ектаў Беларусі. Напрыклад, мемарыялы ў Віцебску, Гомлі і Магілёве, прысвечаныя воінам-інтэрнацыяналістам, выкананыя як праваслаўныя капліцы, а цэнтральны мемарыял ахвярам аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Гомлі – праваслаўная святыня-помнік[111].

Менавіта з ініцыятывы і на грошы Беларускай праваслаўнай царквы страчваюцца ўнікальныя здабыткі мясцовых архітэктурных школаў, што прыйшлі ў Беларусь з Заходняй Еўропы. Толькі ў 2024 г. былі знішчаныя аблічча наступных святыняў.

- У Аздамічах на Століншчыне на драўляную Свята-Траецкую царкву 1893 г. паставілі пазалочаную “цыбуліну”[112].
- Траецкую царкву ў Слоніме, пабудаваную як касцёл пры кляштары бернардынаў у сярэдзіне XVII ст., перамалявалі ў ярка-зялёны

104 https://vymno.schools.by/news/1448461

105 Имя Героя Советского Союза Лыщени вернули средней школе в Любанском районе / Мінская праўда, 02.06.22: https://mlyn.by/02062022/imya-geroya-sovetskogo-soyuza-lyshheni-vernuli-srednej-shkole-v-lyubanskom-rajone/

106 Имя прославленного летчика присвоено столичной средней школе № 205 / Минск Новости, 27.11.2024: https://minsknews.by/imya-proslavlennogo-letchika-prisvoeno-stolichnoj-srednej-shkole-205/

107 В СШ №10 имени В. И. Пеленицына прошла торжественная церемония / Слонимский районный исполнительный комитет, 04.03.2024: https://slonim.gov.by/ru/slonim-news-ru/view/v-ssh-10-imeni-v-i-pelenitsyna-proshla-torzhestvennaja-tseremonija-24630-2024/

108 Лицей им. Ф.Э.Дзержинского БГУ, 17.06.2024 https://t.me/LyceumBSU/1792

109 https://penbelarus.org/2023/12/18/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-snezhnya-2023-goda.html

110 https://penbelarus.org/2024/07/17/hronika-parushennyau-pravou-chalaveka-u-sfery-kultury-1-15-lipenya-2024-goda.html

111 Памяць у ландшафце беларускіх гарадоў… С. 28.

112 У Аздамічах на Століншчыне на царкву паставілі пазалочаную «цыбуліну» / Наша Ніва, 15.04.2024: https://nashaniva.com/340805

колер. Такога колеру не можа быць на помніку эпохі Рэнесансу, бо ў той час адсутнічалі ўстойлівыя пігменты. Гісторыя незаконных перабудоваў царквы цягнецца з 2015 г., калі святар самавольна замяніў купалы, пастаўленыя рэстаўратарамі, на залацістыя “цыбуліны”[113].

- У Свята-Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра пачалі рэстаўраваць адзін з найстарэйшых у краіне барочных іканастасаў, які ўжо зведаў радыкальную русіфікацыю. У 2009 г. сем абразоў з іканастасу былі перададзеныя ў Нацыянальны мастацкі музей, пры гэтым барочныя абразы былі замененыя на сучасныя, выкананыя ў “старажытнарускім стылі”[114].
- Вакол царквы Раства Прасвятой Багародзіцы ў Мураванцы Шчучынскага раёну спілавалі дрэвы, якія атачалі яе з усіх бакоў. Царква належыць да ліку нешматлікіх святыняў у стылі беларускай



Траецкая царква ў Слоніме пафарбаваная ў ярка-зялёны колер.

Фота: тэлеграм-канал «Спадчына»

готыкі, у якіх адчуваецца ўплыў рэнесанснай архітэктуры. Спілаваныя дрэвы могуць дорага адгукнуцца ў імкненні прасунуць аб’ект у спіс Сусветнай спадчыны UNESCO, бо радыкальнае змяненне ландшафту не вітаецца Камітэтам сусветнай спадчыны. Гэтак, у 2009 г. са спісу UNESCO выкраслілі Дрэздэнскую даліну Эльбы. Прычынаю сталася будаўніцтва мосту, які “разбурыў культурны ландшафт”[115].

Змены ў аблічы гістарычна-культурных каштоўнасцяў Беларусі на працягу дзесяцігоддзяў часта не толькі застаюцца без адпаведных пакаранняў з боку мясцовых уладаў, але нават не фіксуюцца. Відавочна, сістэмная праца ў гэтым кірунку неабходная, каб нашчадкі мелі магчымасць

113 Праваслаўны прыход у Слоніме пакараюць за незаконна перамаляваны храм XVII стагоддзя / Наша Ніва, 22.10.2024: https://nashaniva.com/353860

114 У Жыровіцкім манастыры разабралі іканастас, з якога раней выкінулі беларускія абразы / Наша Ніва, 27.09.2024: https://nashaniva.com/352139

115 Вакол царквы-крэпасці ў Мураванцы спілавалі ўсе старыя дрэвы — сумныя / наша Ніва, 27.09.2024: https://nashaniva.com/352123

вярнуць беларускім святыням гістарычны выгляд і месца ў еўрапейскай культурнай прасторы.

Беларуская праваслаўная царква бярэ таксама ўдзел у прасоўванні знакавых гістарычных постацяў расійскага афіцыйнага пантэону. Асобае месца ў ім займае фігура Аляксандра Неўскага. У Расіі князь узведзены ў ранг адной з ключавых фігураў нацыянальнай гісторыі. Пасля анексіі Крыму ў 2014 г. і ўварвання ва Украіну культ Аляксандра Неўскага, абвешчанага нябесным заступнікам сухаземных войскаў і марской пяхоты Расіі, узмацніўся. У знішчаным расійскай арміяй Марыупалі адкрылі пампезны помнік князю, а таксама пабудавалі школу “Неўская” і жыллёвы комплекс “Неўскі”. Бюсты Неўскага ўсталяваныя ў Казахстане (Алматы), Прыднястроўі (Бендэр) і Сірыі (на расійскай вайсковай базе).

Аляксандр Неўскі не меў ніякага дачынення да гісторыі Беларусі і быў прыхільнікам татарскага панавання. Тым не менш мы маем ужо два помнікі ў ягоны гонар. Першы з’явіўся ў Віцебску ў пачатку 2016 г. Ён адрозніваўся ад звыклых выяваў князя, бо беларускія скульптары паказалі яго разам з жонкаю, віцебскаю княжной Аляксандрай, і сынам Васілём. Надпіс на пастаменце быў зроблены на беларускай мове. Новы помнік Неўскаму адкрылі ў лістападзе 2023 г. у Мінску, дзе князь паўстае ў звыклым вобразе палкаводца. Гэтыя помнікі дазваляюць разгледзець эвалюцыю ў прасоўванні расійскага наратыву ў Беларусі. Калі віцебскі помнік быў спробай упісаць князя ў мясцовы культурны кантэкст, то мінскі сведчыць пра ўзмацненне палітычнай і ідэалагічнай залежнасці рэжыму Лукашэнкі ад Масквы і мэтанакіраванае прасоўванне знакавых фігураў “русского мира”[116].

## Высновы

Улады Беларусі выкарыстоўваюць усе магчымыя сродкі, каб ачарніць ды забараніць нацыянальную сімволіку і покліч “Жыве Беларусь!”, наўмысна звязваючы іх з дзейнасцю калабарантаў часу Другой сусветнай вайны. Для гэтага змяняюць заканадаўства, караюць, прыніжаюць і пераследуюць кожнага, хто застаецца верным нацыянальным сімвалам.

Любое выкарыстоўванне нацыянальнай сімволікі – нават манікюр у белых і чырвоных колерах або аватарка ў сацыяльных сетках – лічыцца несанкцыянаваным пікетам і караецца затрыманнем або буйным штрафам паводле артыкулаў Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэннях.

Найбольш прадстаўнікоў улады палохаюць супольныя дзеянні грамадзянаў, іх пераследуюць ужо паводле Крымінальнага кодэксу. Жорсткія пакаранні (5 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму) атрымалі асобы, якія вывесілі бел-чырвона-белы сцяг на даху шматпавярховага дому. Побач лунаў і сцяг Украіны як сімвал салідарнасці з барацьбой украінскага народу.

116 Памятник Александру Невскому в Минске. Режим Лукашенко проходит очередной тест на лояльность Кремлю, Александр Фридман / Позірк, 14.11.2023: https://pozirk.online/ru/longreads/48810/

Жахлівая логіка ўладаў зрабіла адказнымі за распаўсюд “ідэі беларускага нацыяналізму” заснавальнікаў крамаў з нацыянальнаю сімволікаю. Існаванне футболак, нататнікаў, чахлоў для пашпартоў і тэлефонаў з такою сімволікаю здаецца ўладам небяспечным. Заснавальніка крамы Symbal.by Паўла Белавуса абвінавацілі ў спробе змяніць дзяржаўны лад Беларусі, ён атрымаў 13 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Сілавікі імкнуцца кантраляваць паводзіны людзей дома, на працы, у вольны час. Улады дабралася да цела чалавека: татуяванні з нацыянальнаю сімволікай абвешчаныя па-за законам. Грамадства паступова пазбаўляюць права на асабістае жыццё. Гэта адзін з выразных сімптомаў таго, што аўтарытарны рэжым пераўтвараецца ў таталітарны.

Рэзка звужаецца прастора беларускай мовы. У тапаніміцы знікла беларуская лацінка. Паслядоўна вынішчаецца беларускамоўная прэса: закрываюцца газеты, часопісы і выдавецтвы, папаўняюцца спісы забароненых кніг і арганізацыяў. Пад забарону трапіў верш зоркі першай велічыні на беларускім літаратурным небасхіле – Янкі Купалы, у якім прагучала неўміручае “Жыве Беларусь”. За антырасійскую скіраванасць аб’яўленыя “экстрэмісцкімі” творы заснавальніка літаратурнай беларускай мовы Вінцэнта Дунін-Марцінкевіча. Творчасць дзеяча беларускага нацыянальнага адраджэння Вацлава Ластоўскага здолелі забараніць двойчы. Нарэшце, у 2024 г. улады афіцыйна прызналі факт спалення “экстрэмісцкіх” кніг.

Грамадства імкнуцца вярнуць у эпоху адзінай “вернай” ідэалогіі. Калі пенсіянераў арыштоўваюць за чытанне беларускіх кніг, гэта не абсурд, а татальнае знішчэнне магчымасці захаваць асабістую беларускамоўную прастору. За 10 гадоў (2014–2024) колькасць навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю на беларускай мове, скарацілася на 34,4%, а на рускай павялічылася на 22,6%[117].

Тапанімічная прастора Беларусі захоўвае стары багаж, назапашаны за гады русіфікацыі і саветызацыі, які так і не прайшоў праз дэкамунізацыю і дэкаланізацыю ў постсавецкі перыяд. Неапраўдана мала месца ў тапаніміцы і мемарыяльнай прасторы займаюць аб’екты, што нагадваюць пра эпоху старажытнасці, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Фактычна адсутнічаюць назвы вуліцаў і помнікі ў гонар дзеячаў нацыянальнага адраджэння XIX – пачатку XX стст., што негатыўна адбіваецца на калектыўнай памяці беларусаў.

Адначасова афіцыйная памяць пра Вялікую Айчынную вайну і савецкі перыяд працягвае акупаваць грамадскую прастору:

- дзясяткі беларускіх школаў атрымалі імёны вайскоўцаў – герояў Другой сусветнай вайны, удзельнікаў аперацыяў савецкай арміі ў Егіпце, Эфіопіі і Афганістане. У той жа час гімназію ў Свіслачы пазбавілі імя нацыянальнага героя Беларусі Кастуся Каліноўскага, а ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту атрымаў імя аднаго з галоўных катаў беларускага народу – Фелікса Дзяржынскага;

---

117 За 10 лет количество школьников, обучающихся на белорусском языке уменьшилось на треть / ПОЗІРК, 13.05.2025: https://pozirk.online/ru/news/137901/

- пры беспасярэднім удзеле ўладаў адбываецца знішчэнне і знявага месцаў памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, а таксама пахаванняў удзельнікаў Войска Польскага і Арміі Краёвай;
- з ініцыятывы і за грошы Беларускай праваслаўнай царквы ажыццяўляецца сучасная “рэканструкцыя” святыняў, у выніку якой страчваюцца ўнікальныя здабыткі мясцовых архітэктурных школаў, якія сфармаваліся пад уплывам заходнееўрапейскага мастацтва.

Ува ўсіх выпадках адсутнічае сістэматычная фіксацыя зменаў. Ва ўмовах немагчымасці паўплываць на сітуацыю ў Беларусі такая фіксацыя набывае прыярытэтнае значэнне.

Спробы пазбавіць вуліцы беларускіх гарадоў савецкіх назваў – Леніна, Маркса, Энгельса, Ландара, Кнорына ды інш. – не далі плёну ў 1990-ыя гг. Перашкодзіла не толькі адсутнасць рашучасці ў прадстаўнікоў мясцовай улады, але і інертнасць жыхароў, адсутнасць згоды сярод прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.

Шырокая грамадская дыскусія ў гэтым пытанні, абмеркаванне канкрэтных варыянтаў перайменаванняў, рыхтаванне гістарычных абгрунтаванняў і праектнай дакументацыі – неабходныя ўмовы сёння для станоўчых пераменаў заўтра. Толькі паслядоўныя рэгулярныя крокі ў названым кірунку здольныя вярнуць беларускай тапаніміцы яе нацыянальнае аблічча і культурна-гістарычную самабытнасць.

## 2. Дзяржаўная стратэгія ў галіне гістарычнай адукацыі

### Змест падручнікаў па гісторыі для агульнаадукацыйных установаў

> Не варта сябе падманваць: вобраз іншых народаў або ўласны вобраз, што жыве ў нашай душы, залежыць ад таго, як у дзяцінстве нас вучылі гісторыі.
> М. Фэро[1]

Беспрэцэдэнтнаю з'явай у беларускай адукацыйнай прасторы стаўся выпуск дапаможнікаў, прысвечаных тэме генацыду беларускага народу, створаных пры ўдзеле супрацоўнікаў Генеральнай пракуратуры[2]. Падручнікі прызначаныя для ўсіх класаў агульнаадукацыйных школаў, пачынаючы з 1-га. Вывучаць гісторыю ўсе беларускія школьнікі цяпер пачынаюць не проста з ваеннай тэмы, а з апісання карных аперацыяў і пакутаў беларусаў, у тым ліку іхных аднагодкаў. Гэта гісторыя страху і гвалту, ахвяраў і мужнасці. Пры гэтым такія неабходныя для нармальнага развіцця дзіцяці станы, як радасць, бяспека, утульнасць роднага дому ў гэтай гісторыі адсутнічаюць.

На момант публікацыі новых школьных падручнікаў аўтары займалі наступныя пасады: Валерый Талкачоў – начальнік упраўлення ў справе




Навучальныя дапаможнікі, прысвечаныя тэме генацыду беларускага народа.

Фота: nastgaz.by

1 Ферро М. Как рассказывают историю детям в разных странах мира. Ферро; перев. с франц. М., 1992

2 Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны (1-4 классы): Учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. Минск, 2023.
Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны (5-9 классы): Учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. Минск, 2023.
Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны (10-11 классы): Учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. Минск, 2023.

нагляду за расследаваннем асабліва важных крымінальных справаў; Вікторыя Фіневіч – начальніца аддзелу ў справе нагляду за выкананнем заканадаўства адносна няпоўнагадовых і моладзі; Валерыя Таратынка – старэйшая пракурорка ўпраўлення ў справе нагляду за расследаваннем асабліва важных крымінальных справаў; Алена Мох – загадчыца лабараторыі гістарычна-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі Нацыянальнага інстытуту адукацыі; Вольга Пеўзнер – работніца аддзелу метадычнага забеспячэння той жа лабараторыі.

Рэдактар інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў “Генацыд беларускага народу” – генеральны пракурор Андрэй Швед[3]. У снежні 2020 г. Еўразвяз увёў супраць яго санкцыі за рэпрэсіі супраць грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай апазіцыі[4].

Аналіз зместу дапаможнікаў прыводзіць да наступных высноваў.

- Дапаможнікі не адпавядаюць узроставым асаблівасцям школьнікаў, перагружаныя складанай інфармацыяй.
- Змяшчаюцца матэрыялы, прыклады нянавісці і гвалту, якія могуць негатыўна ўплываць на дзіцячую псіхіку.
- Паняцце “генацыд” не раскрытае, адсутнічаюць новыя звесткі пра намер Нямецкага Райху (Deutsches Reich) знішчыць беларусаў падчас Другой сусветнай вайны.
- Новыя звесткі пра колькасць спаленых у гады Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі населеных пунктаў, колькасць ахвяраў акупантаў не абапіраюцца на навуковыя даследаванні.
- Дзеянні польскай Арміі Краёвай (АК) беспадстаўна прыроўненыя да дзеянняў гітлераўскай Нямеччыны, сцвярджаецца, што палякі імкнуліся знішчыць як немцаў, гэтак і беларусаў.
- Аўтары падручнікаў мэтанакіравана звязваюць нацыянальную сімволіку з калабарацыянізмам у гады Другой сусветнай вайны. Дзеянні калабарацыяністаў прыраўноўваюцца да дзеянняў нацыстаў. Без доказаў сцвярджаецца, што носьбіты нацыянальнай сімволікі “бралі ўдзел у расстрэлах ваеннапалонных і мірнага насельніцтва, рабаваннях на карысць нацысцкай Нямеччыны, знішчэнні жытла ды іншай маёмасці, без якой насельніцтва асуджалася на доўгую і пакутлівую смерць”[5].

У інфармацыйна-аналітычных матэрыялах, падрыхтаваных пад кіраўніцтвам генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь А. Шведа, пытанням, пазначаным у апошніх двух пунктах, надаецца ключавая ўвага. Назва раздзелу – “Страшная сувязь часоў” – перадае яго сутнасць. Раздзел займае 44 з 169 старонак друкаванага тэксту, амаль трэць выдання. Менавіта

3 Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people : информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь ; под общей редакцией Генерального прокурора Республики Беларусь А.И. Шведа. Минск, 2022.

4 Council Implementing Decision (CFSP) 2020/2130 of 17 December 2020 implementing Decision 2012/642/CFSP concerning restrictive measures against Belarus / Official Journal of the European Union, L 426 I, Volume 63, 17 December 2020: https://eur-lex.europa.eu/legal-content/EN/TXT/PDF/?uri=OJ:L:2020:426I:FULL&from=EN

5 Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны (10-11 классы), с. 41.

тэма выкарыстання бел-чырвона-белай сімволікі – цэнтральная ў дапаможніку. Падзеі Другой сусветнай вайны выкарыстоўваюцца як фон, неабходны для раскрыцця “злачынстваў” сучасных праціўнікаў улады Лукашэнкі.

5 студзеня 2022 г. быў прыняты Закон аб генацыдзе беларускага народу[6]. Пад генацыдам беларускага народу разумеюцца злачынствы, учыненыя нацыстамі ды іхнымі памагатымі ў перыяд з 22 чэрвеня 1941 г. да 31 снежня 1951 г. на тэрыторыі БССР. Закон унёс змены ў Крымінальны кодэкс: артыкул 130-2 устанаўлівае крымінальную адказнасць за непрызнанне генацыду беларускага народу. Максімальнае пакаранне – да 5 гадоў пазбаўлення волі. 18 сакавіка 2024 г. Вярхоўны Суд прызнаў Уладзіміра Катрука, які памёр яшчэ ў 2015-м, вінаватым у генацыдзе беларусаў за ўдзел у карных аперацыях у Другую сусветную вайну[7].

30 кастрычніка 2024 г. Андрэю Савіцкаму прысудзілі 3 гады калоніі за “адмаўленне генацыду беларускага народу”[8]. Фактычна грамадзянін Беларусі атрымаў тэрмін за іншадумства.

Падкрэслім паслядоўнасць падзеяў: спачатку прымаюць закон, а затым паспешліва, без навуковых абгрунтаванняў, рыхтуюць комплекс навучальных дапаможнікаў, якія мусяць апраўдаць дзеянні рэжыму. Увесь цыкл дапаможнікаў пра генацыд беларускага народу ўяўляе сабою зборнік псеўданавуковых прапагандысцкіх матэрыялаў, напоўненых нянавісцю і страхам.

З 2020-га да 2024 г. былі падрыхтаваныя чатыры новыя падручнікі па гісторыі Беларусі для агульнаадукацыйных установаў адукацыі.

Падручнік для 6-х класаў па гісторыі Беларусі са старажытнага часу да канца XV ст. (2023)[9] – перавыданне пад адною вокладкаю дзвюх частак аналагічнага выдання, падрыхтаванага ў 2016-м. Змест, ацэнкі падзеяў у ім не змяніліся.

З двух новых падручнікаў для 10-х (2020)[10] і 11-х класаў (2021)[11] першы фактычна страціў актуальнасць, бо ў снежні 2023-га міністр адукацыі Андрэй Іванец анансаваў стварэнне новага, інтэграванага курсу. У 10–11-х класах замест гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі ўвялі курс “Гісторыя Беларусі

---

6 Подписан Закон о геноциде белорусского народа в годы Великой Отечественной войны / Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, 05.01.2022: https://president.gov.by/ru/events/aleksandr-lukashenko-podpisal-zakon-o-genocide-belorusskogo-naroda

7 Приговор Верховного Суда Республики Беларусь по делу Владимира Катрюка / Официальный сайт Генеральной прокуратуры Республики БЕларусь, 18 марта 2024 года: https://prokuratura.gov.by/ru/activity/rassledovanie-ugolovnogo-dela-o-genotside/iz-materialov-ugolovnogo-dela/prigovor-v-otnoshenii-natsistskogo-karatelya-katryuka/

8 Штукатура приговорили к трем годам колонии за “отрицание геноцида беларусского народа” / ВЯСНА, 05.11.2024: https://spring96.org/ru/news/116634

9 Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6 кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С. М. Цемушаў, Ю. М. Бохан ; пад рэд. І. А. Марзалюка. Минск, 2023.

10 Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання (з электрон. дадаткам для павышанага ўзроўню) / В. А. Белазаровіч, С. А. Кудраўцава, А. У. Любы ; пад рэд. В. А. Белазаровіча. Мінск, 2020.

11 Гісторыя Беларусі, XIX – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. В. Касовіч [і інш.] ; пад рэд. А. В. Касовіча, А. П. Салаўянава. Мінск, 2021.

ў кантэксце сусветнай гісторыі"[12]. Быў напісаны новы навучальны дапаможнік для 10-га класу (2024), які ахоплівае перыяд ад старажытнага часу да XIII ст.[13]

Змены ў змесце новых падручнікаў праанілізаваныя ў даследаваннях А.Ластоўскага[14] і І.Раманавай[15]. Вылучым асноўныя моманты.

- Вярнулася вызначэнне вайны 1812 г. у якасці "айчыннай", што цалкам адпавядае расійскаму гістарычнаму дыскурсу.
- Удзельнікі антырасійскіх паўстанняў XIX ст. паказаныя як "польскія дваранскія рэвалюцыянеры".
- Найбольш адчувальныя змены адбыліся ў рэпрэзентацыі паўстання 1863–1864 гг. У нацыянальнай гістарыяграфіі паўстанне называецца "пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага", у падручніку гэтага няма. Адсутнічае інфармацыя пра "Мужыцкую праўду" і Лісты з-пад шыбеніцы. Нарэшце, з падручніку прыбралі партрэт Кастуся Каліноўскага.
- Вельмі палітызаваная і антыпольская рэпрэзентацыя выкарыстоўваецца да часу ўваходу беларускіх земляў у склад міжваеннай Рэчы Паспалітай. Стаўленне Польшчы да беларускага насельніцтва апісваецца як "прамысловая паланізацыя", "ваенная дыктатура", "нацыянальны прыгнёт", "паліцэйскі тэрор". Аўтары падрабязна апісваюць катаванні ў канцлагеры ў Бярозе-Картузскай, пры гэтым не параўноўваюць сітуацыі са сталінскімі лагерамі.
- З аднаго боку, масавыя пратэсты пасля выбараў 2020-га не згадваюцца ў падручніках, з другога – відавочная аўтарская рэакцыя на гэтыя падзеі: сцвярджаецца, што падчас Другой сусветнай вайны бел-чырвона-белы сцяг належаў паліцаям і калабарантам, а выраз "Жыве Беларусь" – аналаг нацысцкага вітання "Heil Hitler".
- Яўна палітызавана паказаныя гістарычныя асобы. Адсутнічаюць згадкі пра лідара незалежнай Беларусі Станіслава Шушкевіча і лаўрэатку Нобэлеўскай прэміі Святлану Алексіевіч. Затое кіраўнік Усерасійскай надзвычайнай камісіі ў справе барацьбы з контррэвалюцыяй і сабатажам Фелікс Дзяржынскі паказаны як выбітны дзеяч беларускай зямлі.

Цяжка пагадзіцца з меркаваннем экспертаў А. Ластоўскага[16] і В Мажэйкі[17], што падручнік – гэта "не фінальная версія", а перадача інфармацыі залежыць

---

12 О правилах приема в вузы, учебниках и трендах в образовании: Андрей Иванец подводит итоги года / "СБ. Беларусь сегодня", 26.12.2023: https://www.sb.by/articles/v-fokuse-vnimaniya-kontrol-znaniy.html

13 Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. Мінск, 2024.

14 Ластоўскі А. Беларускія падручнікі па гісторыі як люстэрка дзяржаўнай гістарычнай палітыкі Аналітычная запіска / 07.02.2025: https://t.me/beliph/805

15 Ramanava I. "Mind must be painted uniformly": Teaching History in Belarusian Schools / Belarus Research Network on Neighborhood Policy, 2023: https://belarusnetwork.org/wp-content/uploads/2023/10/Iryna_Ramanava_Analytical-Article.pdf

16 Як змяніліся беларускія падручнікі па гісторыі? / Budzma.org, 16.12.2024: https://budzma.org/news/belaruskiya-padruchniki-pa-gistoryi.html

17 «Праз школы ў розум дзяцей заходзіць «русский мир». Як у Беларусі русіфікуюць адукацыю / Радыё Свабода 24.11.2022: https://www.svaboda.org/a/32146896.html

ад настаўніка, які можа змяніць акцэнты. Тэарэтычна эксперты маюць рацыю, практычна ж яны не знаёмыя з сучаснаю сітуацыяй у беларускіх школах. Ва ўмовах заахвочвання даносніцтва, магчымасці скіроўваць скаргі наўпрост у праваахоўныя органы, калі "няправільная" трактоўка гістарычных падзеяў можа прывесці да крымінальнай справы, настаўнікі асцерагаюцца агучваць нават тыя ацэнкі падзеяў, што захаваліся ў дапаможніках 2017–2019 гг., але пасля 2020-га трапілі пад жорсткую крытыку прапагандыстаў рэжыму Лукашэнкі.

Усяго за перыяд незалежнасці Беларусі выйшлі пяць пакаленняў падручнікаў па гісторыі[18]. Іх змест прааналізаваны ў шэрагу навуковых артыкулаў і манаграфіяў[19]. Даследнікі прыйшлі да шэрагу высноваў.

Радыкальнае змены гістарычнае канцэпцыі пасля 2020-га ў школьных падручніках не адбылося, у аснове захоўваецца адаптаваная версія нацыянальнага гістарычнага наратыву. У ім гісторыя Полацкага княства засвоеная як першая форма беларускай дзяржаўнасці, а гісторыя "беларуска-літоўскай дзяржавы" Вялікага Княства Літоўскага займае нішу "залатога веку".

У той жа час перыяд Рэчы Паспалітай апісваецца ў тэрмінах нацыянальнага прыгнёту і змагання за ўз'яднанне з Расіяй. Яшчэ больш выразнае ўваскрашэнне прапагандысцкіх антыпольскіх штампаў назіраецца пры характарыстыцы міжваеннага часу.

Адначасова перыяд Расійскай імперыі падаецца як важны для нацыянальнага станаўлення беларускага народу, а час у складзе СССР – як надзвычай плённы для сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Пры гэтым палітычныя рэпрэсіі характарызуюцца як нешта нязначнае. Сутнасць таталітарнага рэжыму не раскрываецца, ГУЛАГ не згадваецца.

Тэма сталінскіх рэпрэсіяў за ўсе гады незалежнасці так і не была раскрытая ў навучальнай літаратуры. Відавочна, наступствы гэтай "недасказанасці" беларускае грамадства адчувае на сучасным вітку гісторыі.

Ёсць і іншыя тэмы, значнасць якіх рэзка ўзрасла пасля 2020 г.

Па-першае, вызначэнне прычынаў і наступстваў вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітаю 1654–1667 гг. Расія, распачаўшы вайсковыя дзеянні супраць Украіны ў 2022-м, спасылаецца на сваё "гістарычнае права" на ўкраінскія землі, патрабуе аднаўлення "гістарычнай справядлівасці". Падручнік для 7-х класаў агульнаадукацыйных школаў, падрыхтаваны ў 2017 г.[20], захоўвае беларускае разуменне гэтых падзеяў. Аўтары тлумачаць прычыны ваенных дзеянняў наступным чынам: "Казакі пастанавілі выйсці з-пад падначаленасці Рэчы Паспалітай і перайсці пад уладу расійскага цара. Канфлікт паміж Расійскаю

---

18 Корзюк, А. А. Гістарычная адукацыя ў сярэдняй школе Беларусі (1930-я гг. – першая чвэрць XXI ст.) : манаграфія. Мінск, 2023, с. 41-45.

19 Астроўская Т. Идеология белорусского государства как образовательный проект / Беларусь в европейском контексте: актуальные дискуссии о нациостроительстве, Вильнюс, 2014, с. 53-59. Яна жа. Генеалогия исторической памяти белорусов в контексте образовательных практик , 20.10.2010: https://belinstitute.com/be/article/genealogiya-istoricheskoy-pamyati-belorusov-v-kontekste-obrazovatelnykh-praktik

Любы А. Падручнікі па гісторыі Беларусі як люстэрка фарміравання і эвалюцыі нацыянальнага гістарычнага наратыву ў 1990-ыя – 2010-ыя гады // Przegląd Środkowo-Wschodni. 2022. T.7. C. 155–190 Паноў С. Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь / С. В. Паноў. Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

20 Гісторыя Беларусі, XVI—XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. А. Варонін [і інш.] ; пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп'ян. Мінск, 2017.

дзяржавай і Рэччу Паспалітаю станавіўся непазбежным. У Маскве вырашылі, што найлепшым спосабам развязання гэтага канфлікту будзе наступальная вайна" (с. 122).

Разам з тым застаецца незразумелым, чаму наступленне супраць украінскіх казакоў пачалося на тэрыторыі сучаснай Беларусі, якія наступствы вайна мела для ўдзельнікаў канфлікту. У грамадстве не сфармаваўся самастойны погляд на ваенныя дзеянні ў XVII ст., што значна павышае ўздзеянне расійскай прапаганды ў XXI ст.

Па-другое, у школьных падручніках практычна адсутнічае гісторыя беларускай эміграцыі, інфармацыя на тэму эпізадычная[21]. Гэта важная частка нашай гісторыі, якая патрабуе асэнсавання і больш шырокага асвятлення. Напрыклад, у навучальных дапаможніках Украіны тэмы эміграцыі паказаныя шырока і рознабакова[22]. А ў беларускім грамадстве адсутнічае разуменне прычынаў эміграцыі, колькасці яе хваляў і асноўных кірункаў, складанасцяў і дасягненняў эмігрантаў, асаблівасцяў іхнага штодзённага жыцця. Імёны нашых суайчыннікаў, якія зрабілі значны ўнёсак не толькі ў беларускую, але і ў сусветную навуку ды культуру, забытыя. Асабліва актуальная гэтая тэма сёння, калі мы назіраем новую хвалю эміграцыі, але не ведаем гісторыі і не можам прагназаваць яе развіцця.

Нарэшце, беларускія падручнікі ў значнай ступені насычаныя практычна савецкім наратывам з апісаннем дасягненняў народнай гаспадаркі, ваенных аперацыяў, пераказам артыкулаў заканадаўчых актаў. У іх няма Чалавека і асаблівасцяў ягонага паўсядзённага жыцця. Мы вельмі мала ведаем пра тое, што елі і пілі нашыя продкі, у якія гульні гулялі, як адзяваліся штодня і ўпрыгожваліся, што святкавалі і як аздаблялі жытло.

Яшчэ адна праблема – адсутнасць Асобы на старонках гістарычных выданняў – усведамляецца нават на афіцыйным узроўні. На пасяджэнні Рэспубліканскага савету наконт гістарычнай палітыкі[23] ў траўні 2023 г. міністр культуры Анатоль Маркевіч прапанаваў стварыць электронную базу звестак "Пантэон нацыянальных герояў". Паводле задумы чыноўніка, яна магла б стацца асноваю для распрацоўкі сюжэтаў мастацкіх твораў[24]. Прапанова дасюль не зрэалізаваная. Шматгадовыя высілкі чыноўнікаў у выцісканні з беларускіх навуковых і адукацыйных установаў усяго жывога ды самастойнага, жорсткая барацьба з іншадумствам прывялі да вострага кадравага голаду ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук, Беларускім дзяржаўным

21 Гісторыя Беларусі, XIX — пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. В. Касовіч [і інш.] ; пад рэд. А. В. Касовіча, А. П. Салаўянава. Мінск, 2021. С. 142-143.
Гісторыя Беларусі, другая палова 1940-х гг. XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. аду- кацыі з беларус. мовай навучання / В. М. Фамін, С. В. Паноў, Н. М. Ганушчанка ; пад рэд. В. М. Фаміна. Мінск, 2013. С. 5, 18-19.

22 Історія України: підручник для 9 кл. загальноосвіт. навч. закл. / Н.М. Сорочинська, О.О. Гісем. Тернопіль, 2017.
Історія України: підручник для 9 кл. загальноосвіт. навч. закл. / Ф.Г. Турченко, В.М. Мороко. Київ, 2017.
Історія України: підручник для 11 класу закладів загальної середньої освіти / Г. М. Хлібовська, О. В. Наумчук, М. Є. Крижановська, І. Б. Гирич, І. О. Бурнейко. Тернопіль, 2019.

23 Пантеон национальных героев может появиться в Беларуси / БЕЛТА, 16.05.2023: https://belta.by/society/view/panteon-natsionalnyh-geroev-mozhet-pojavitsja-v-belarusi-566779-2023/

24 Пантеон национальных героев может появиться в Беларуси / БЕЛТА, 16.05.2023: https://belta.by/society/view/panteon-natsionalnyh-geroev-mozhet-pojavitsja-v-belarusi-566779-2023/

універсітэце ды іншых установах. Новыя задачы, якія так шчодра сыплюцца зверху, ужо няма каму выконваць.

## Падручнікі для вышэйшых навучальных установаў і дзейнасць расійска-беларускай гістарычнай камісіі для “абароны гістарычнай праўды”

У сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі ў 2003 г. увялі курс “Ідэалогія беларускай дзяржавы”, які фактычна служыў інструментам прапаганды і ўсхваляў дасягненні рэжыму Лукашэнкі (з 2014 г. ён стаўся часткаю інтэграванага модулю “Паліталогія”)[25]. Адначасова захоўваўся абавязковы курс “Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацыяў)”.

З 2022 г. ва ўстановах вышэйшай адукацыі рэалізуецца новая мадэль цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплінаў.[26] Чатыры модулі – *Філасофія, Эканоміка, Паліталогія, Гісторыя* – былі заменены на тры: *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці, Філасофія, Сучасная палітычная эканомія*. Згодна з праграмаю, на вывучэнне новае дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” на дзённай форме атрымання адукацыі адведзеныя 54 аўдыторныя гадзіны[27]. Аўтар ідэі новага курсу і рэдактар падручніку[28] І.Марзалюк звярнуў увагу, што гэта “гістарычна-палітычная, гістарычна-грамадазнаўчая дысцыпліна, якая вывучае развіццё інстытутаў дзяржавы ад вытокаў да сёння”[29].

Сапраўды, навучальны дапаможнік падзелены на тры прыблізна роўныя часткі. З іх толькі першы раздзел раскрывае этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці. Другі прысвечаны асноўным прынцыпам дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь, трэці разглядае Беларусь на скрыжаванні культураў і цывілізацыяў. У выніку падчас вывучэння курсу аднолькавая колькасць гадзінаў (4) адведзеная на вывучэнне тэмаў:

- Вялікае Княства Літоўскае – поліэтнічная дзяржава Усходняй Еўропы;
- Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы;
- Беларусь у геапалітычнай прасторы.

Фактычна змест навучальнага курсу сведчыць, што выкладанне айчыннай гісторыі ў ВНУ спыненае (за выключэннем студэнтаў, якія навучаюцца на гістарычных спецыяльнасцях).

---

25 Концепция оптимизации содержания, структуры и объема цикла (модуля) социально-гуманитарных дисциплин в учреждениях высшего образования / Республиканский портал проектов образовательных стандартов высшего образования, 11.05.2022: https://edustandart.by/vse-novosti/utverzhdenie-dokumentov/133-kontseptsiya-optimizatsii-soderzhaniya-struktury-i-ob-ema-tsikla-sgd

26 Там жа.

27 Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей першай ступені вышэйшай адукацыі № УД-11207 /вуч. / Электронная бібліятэка БДУ, 30.06.2022: https://elib.bsu.by/handle/123456789/290008

28 Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. / І.А. Марзалюк [і інш.]; пад агул. рэд. І.А. Марзалюка; навук. рэд. Г.Г. Краско. Мінск, 2022.

29 «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Даведаліся, пра што новы курс і чым адметны падручнік / Минск Новости, 20.11.2022: https://minsknews.by/gistoryya-belaruskaj-dzyarzha%D1%9Enasczi-davedalisya-pra-shto-novy-kurs-i-chym-admetny-padruchnik/

На нашых вачах паўтараецца сітуацыя стогадовай даўніны, калі пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі пачалі ламаць сістэму гістарычнай адукацыі. Перад савецкім урадам стаяла задача ідэалагічнага выхавання насельніцтва ў сацыялістычным духу. Вывучэнне айчыннай гісторыі, якая ўва ўсе часы спрыяла патрыятычнаму выхаванню, прызналі непатрэбным, гістарычную адукацыю замянялі курсам грамадазнаўства. У курс залучаўся толькі той гістарычны матэрыял, які адпавядаў палітычным задачам. Усё "лішняе" адкідвалася. Ідэолагам комплексных праграмаў стаўся намеснік наркаму асветы М. Пакроўскі. Менавіта яму належыць выраз "гісторыя – гэта палітыка, скіраваная ў мінулае"[30]. Пакроўскі ўзначальваў у тым ліку архіўную службу, дзейнасць якой падлягала поўнаму перагляду. Цяжка ўстрымацца ад аналогіі: на працягу апошніх двух гадоў дырэктарамі вядучых беларускіх архіваў былі прызначаныя былыя сілавікі, а Дэпартамент архіваў і справаводства Міністэрства юстыцыі ўзначаліў генерал-маёр Алег Воінаў.

Галоўнае адрозненне сучаснай сітуацыі ў Беларусі ў тым, што за 30 гадоў кіравання Лукашэнкі праўладныя гісторыкі ды прапагандысты не здолелі сфармуляваць і артыкуляваць уласнай ідэалогіі. Няма стрыжня, на які можна нанізваць гістарычныя факты. Узвышэнне ролі аднаго чалавека не можа такога стрыжня замяніць. У выніку нязручныя факты проста вырываюцца з гістарычнай канструкцыі.

Што аказалася "лішнім" у гісторыі Беларусі для аўтараў падручніку "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці"?

1. Існаванне Рэчы Паспалітай. Пасля тэмы "Вялікае Княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы" ідзе "Беларусь у складзе Расійскай імперыі". Тым, хто не паспявае за гістарычнымі інавацыямі праўладных гісторыкаў, намеснік старшыні Сталай камісіі ў справе адукацыі, культуры і навукі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Даніловіч растлумачыў: згодна з новаю канцэпцыяй беларускай дзяржаўнасці, Рэч Паспалітая не разглядаецца як яе форма, бо "Рэч Паспалітая стваралася на негатыве, сучаснаю моваю кажучы, польскія ўладныя эліты правялі геапалітычную аперацыю, каб паставіць пад свой кантроль Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае"[31].
2. Падзеі вайны 1812 г. Іх апісанне адсутнічае, таму мы не ведаем, ці ўспрымаюць аўтары вайну як "айчынную", як гэта адбываецца на старонках школьных падручнікаў.
3. Заходнебеларускія землі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай.
4. Масавыя пратэсты ў Беларусі пасля выбараў 2020 г. Разам з тым падкрэсліваецца, што "жнівеньскія падзеі 2020-га неабходна

30 Покровский М. Н. Общественные науки в СССР за десять лет. Доклад на конференции марксистско-ленинских учреждений 22.03.1928 г. / Вестник Коммунистической академии. Книга XXVI (2), М., 1928. С. 5–6.

31 Непростая история / Концепция истории белорусской государственности / Телерадиокомпания Гомель, 05.10.2024: https://www.youtube.com/watch?v=tX91GvWouoY

разглядаць як спробу рэалізацыі вонкавымі сіламі на тэрыторыі Беларусі сцэнара "каляровай рэвалюцыі"[32].

Галоўны змест курсу "Гісторыя беларускае дзяржаўнасці" – усхваленне "беларускай мадэлі" сацыяльна-эканамічнага развіцця, заснаванай на "вядучай ролі дзяржавы ў гаспадарчым жыцці і забеспячэнні высокага ўзроўню сацыяльнай абароненасці насельніцтва" і першага беларускага прэзідэнта, які забяспечвае "моцную і эфектыўную дзяржаўную ўладу".

Знайшлося ў падручніку месца гісторыі беларускай дыяспары. Гэта кароткі (на адну старонку) аптымістычны расказ пра ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнага кіравання і грамадскіх арганізацыяў Беларусі з беларусамі замежжа, прыцягненне беларускай дыяспары да ўдзелу ў сацыяльна-эканамічным і культурніцкім развіцці Беларусі, захаванне і падтрыманне яе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Ніякіх праблемаў ці супярэчнасцяў на гэтым шляху аўтары не бачаць.

Тэндэнцыя замоўчваць праблемы і прыхоўваць "непатрэбныя" факты напоўніцу раскрылася ў змесце двух першых супольных расійска-беларускіх падручнікаў для вышэйшых навучальных установаў: "Гісторыя беларускіх земляў і беларускай дзяржавы"[33] і "Гісторыя Саюзнай дзяржавы"[34], выдадзеных у 2023 г.

Нягледзячы на наяўнасць 18 аўтараў, тэкст падручніка "Гісторыя Саюзнай дзяржавы" ўяўляе сабою кароткі (156 старонак) пералік зместу заканадаўчых актаў, накіраваных на аб'яднанне Беларусі і Расіі. У падручніку паслядоўна разглядаецца інстытуцыянальнае афармленне Саюзнай дзяржавы, яе сацыяльна-эканамічнае развіццё, замежная палітыка, пытанні абароны і бяспекі. Тэкст напоўнены паказнікамі, якія не паддаюцца крытычнай ацэнцы. У галіне эканамічнай супрацы праблемаў для аўтараў не існуе, у галіне вайсковай супрацы так званай спецыяльнай вайсковай аперацыі яны ўвогуле не заўважылі.

Першае знаёмства са зместам навучальнага дапаможніку "Гісторыя беларускіх земляў і беларускай дзяржавы" выклікае шок, бо ўся гісторыя Беларусі да 1991 г. увайшла ў раздзел "Гістарычна-геаграфічная даведка" аб'ёмам 30 старонак. Каб ахарактарызаваць дзяржаўны лад, унутраную палітыку, сацыяльна-эканамічнае развіццё і замежнапалітычную дзейнасць Рэспублікі Беларусь у 1991–2020 гг., аўтары вылучылі ўдвая больш месца.

Ці ёсць сэнс характарызаваць змест "даведкі", нават паводле назвы абразлівай для беларусаў? Так, бо ў ім выразна праяўляецца тэндэнцыя, выяўленая ў "Гісторыі беларускай дзяржаўнасці": залучэнне ў навучальны дапаможнік толькі таго гістарычнага матэрыялу, які дазваляе прэзентаваць рэжым А. Лукашэнкі як вяршыню дзяржаўнага будаўніцтва беларускага народу, а саюз з Расіяй – як адзіна магчымы і гістарычна абумоўлены.

---

32 Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. / І.А. Марзалюк [і інш.]; пад агул. рэд. І.А. Марзалюка; навук. рэд. Г.Г. Краско. Мінск, 2022. С. 413.

33 История белорусских земель и белорусского государства. Краткий очерк. Материалы к лекционному курсу. Учебное пособие для вузов. Под ред. В.В. Даниловича, О.В. Солоповой, СПб. 2023.

34 История Союзного государства. Учебное пособие для высших учебных заведений, Отв. ред. С.Л. Кандыбович; О.В. Солопова, Д.А. Андреев, В.В. Данилович, В.Л. Лакиза, А.Г. Кохановский, И.В. Жилинская. Москва, 2023.

Першыя супольныя расійска-беларускія падручнікі для ВНУ.

Фота: Book24 і belros.tv







Праясняецца таксама прынцып, на падставе якога аўтары надаюць большую або меншую ўвагу розным гістарычным перыядам і праблемам. Пытанні, якія не выклікаюць праблемаў, выходзяць на першы план. Канфліктныя тэмы намагаюцца схаваць, як дзеці хаваюць разбіты кубак у дальні кут шафы. Тры прыклады.

- Два стагоддзі беларускай гісторыі ў адным абзацы: "У другой палове XVI – першай палове XVII стст. у Рэчы Паспалітай разгортвалася барацьба за ўладу паміж буйнымі магнатамі. Гэтыя працэсы і страта больш як паловы колькасці беларускага этнасу ў цяжкіх войнах XVII – пачатку XVIII стст. з Асманскай імперыяй, Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй яшчэ больш запаволілі працэс нацыянальнага развіцця беларускага народу" (с. 15).
- Індустрыялізацыя і калектывізацыя ў адным абзацы: "У 1920–1930-ыя гг. у Савецкай Беларусі найбольш актыўна адбываліся інтэнсіўныя працэсы індустрыялізацыі, з'яўляліся новыя галіны як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Палітыка развіцця хутараў 1920-х гг. змянілася актыўнаю калектывізацыяй у 1930-х" (с. 25).
- Сталінскія рэпрэсіі ў адным сказе: "Палітычная барацьба сярод партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва вылілася ў рэпрэсіі, якія аслаблялі развіццё беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці" (с. 26).

У "даведцы" паўтараюцца ўжо вядомыя нам з курсу "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" тэзісы:

- Польшча ўцягнула Вялікае Княства Літоўскае ў вайну з Маскоўскім царствам за Лівонію, а потым прымусіла пайсці на падпісанне Люблінскай уніі. У выніку чаго былі створаныя спрыяльныя ўмовы для паланізацыі і акаталічвання праваслаўнага насельніцтва ВКЛ (с. 14–15).
- У адрозненне ад каланіяльных імперыяў Захаду, Расійская імперыя "не імкнулася выціскаць сродкі з падуладных тэрыторыяў, а развівала іх сацыяльна-эканамічны і духоўна-культурны

> патэнцыял". У Расійскай імперыі беларусы разглядаліся як частка трыадзінага тытульнага народу імперыі. "У святле вышэйсказанага натуральна, што спробы аднавіць Рэч Паспалітую падчас паўстанняў 1794, 1830–1831, 1863–1864 гадоў не былі падтрыманыя большасцю беларускага народу і не былі зрэалізаваныя" (с. 16).

Найбольшая ўвага ў "Гістарычна-геаграфічнай даведцы" надаецца гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і савецкай Беларусі. Адсутнічае, праўда, ноу-хау беларускай адукацыйнай прасторы – аповед пра "генацыд беларускага народу". Хутчэй за ўсё з банальнай прычыны: расійска-беларускі падручнік і дапаможнікі пра генацыд рыхтаваліся адначасова.

Сучасны этап беларускае дзяржаўнасці пачынаецца з апісання праблемаў. На думку аўтараў, першы этап існавання маладой Рэспублікі Беларусь (снежань 1991 – сакавік 1994 гг.)

> *характарызаваўся жорсткім палітычным суперніцтвам паміж партыямі і рухамі, якое суправаджалася ростам нацыяналізму. Усё гэта разам з няўдалай эканамічнай і сацыяльнай палітыкай, якая праводзілася камандай С. Шушкевіча, ростам злачыннасці ў краіне, карупцыяй ува ўсіх эшалонах улады прывяло ў выніку да страты тагачасным кіраўніцтвам рэспублікі павагі, даверу і папулярнасці сярод насельніцтва (с. 37–38).*

У гэтых няпростых умовах першым прэзідэнтам абралі А. Лукашэнку, які для развязання праблемаў звярнуўся да практыкі рэспубліканскіх (агульнанародных) рэферэндумаў. У выніку рэферэндумаў расійскай мове надалі статус дзяржаўнай, ухвалілі палітычную інтэграцыю з Расіяй, адбылося вяртанне да савецкай сімволікі, а прэзідэнт атрымаў права распускаць Вярхоўны Савет (с. 39). У 2004 г. з Канстытуцыі былі выдаленыя абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў (с. 43).

Агляд беларускай эканомікі аўтары падручніку пачынаюць з канстатацыі факту, што ў 1991–1995 гг. народная гаспадарка аказалася ў глыбокім эканамічным крызісе (с. 45). Вядома, ён быў пераадолены пад кіраўніцтвам мудрага лідара. Далей ідзе аповед пра бесперапынныя перамогі, рост ВУП.

Нечакана вялікае месца на старонках падручніку адвялі развіццю беларускай культуры (26 старонак). Як правіла, у сціслых падручніках аўтары аддаюць перавагу аналізу ўнутрыпалітычных падзеяў, вызначаюць асноўныя кірункі замежнай палітыкі, а дасягненні культуры вымушана адыходзяць на другі план. Праўда, такі падыход характэрны пры напісанні гісторыі незалежнай дзяржавы. А калі гаворка, напрыклад, пра гісторыю Валагодскай вобласці, то чаму б не прысвяціць больш месца рэгіянальным культурным асаблівасцям. Гісторыя Беларусі, здаецца, разглядаецца ў такім ключы.

На жаль, спроба надаць больш увагі развіццю беларускай культуры выглядае правальнаю. Ці можа ўзбагаціць студэнтаў пералік прозвішчаў?

У тэксце:

> *Многія беларускія паэты, якія працавалі ў 1950–1970-х гадах – А. Куляшоў, П. Броўка, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін і інш., – увайшлі ў гісторыю савецкай літаратуры XX ст. (с. 90).*

Творчасці Нобэлеўскай лаўрэаткі С. Алексіевіч месца на старонках падручніку не знайшлося.

Ёсць у навучальным дапаможніку актуальная навінка, з’яўленне якой можна толькі вітаць: раздзел “Беларуская дыяспара” (с. 68–69). З яго мы даведваемся, што агульная колькасць беларусаў за мяжою складае 3,5 млн чалавек; існуе грамадскае аб’яднанне “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”; у Расіі зарэгістраваныя больш за 80 грамадскіх арганізацыяў беларускае дыяспары; у Беларусі рэалізоўваецца дзяржаўная праграма “Беларусы ў свеце”. Нарэшце, у 2017 г. у Мінску адкрылі першы на постсавецкай прасторы помнік дыяспары “Беларусам замежжа”. Ідылічная карціна. Праблемных аспектаў у ёй няма.

Магчыма, нейкія праблемы ўзніклі ў Рэспубліцы Беларусь у 2020 г.? Аўтары думаюць інакш. Пра падзеі 2020-га яны паведамляюць толькі тое, што на чарговых выбарах прэзідэнта пераканаўчую перамогу атрымаў А. Лукашэнка (с. 44).

З навуковых дасягненняў апошніх гадоў у падручнік увайшло новае вызначэнне беларускай дзяржаўнасці, распрацаванае ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Згодна з ім, дзяржаўнасць вызначаецца як “унутраная патэнцыйная здольнасць этнанацыянальнай супольнасці і яе эліты, якая забяспечвае права і магчымасць працяглага самастойнага гістарычнага існавання і развіцця” (с. 8). Прафесійная крытыка канцэпцыі змешчаная ў рэцэнзіі Р. Маеўскага[35]. Але дастаткова логікі, каб паставіць пад сумнеў “дасягненне” праўладных гісторыкаў.

Такім чынам, першы расійска-беларускі блін выйшаў камяком. Незразумела, якім метадалагічным падыходам кіраваліся аўтары, рыхтуючы выданне і ці быў ён увогуле. Матэрыял дрэнна структураваны, не раскрытыя прычынна-выніковыя сувязі гістарычных падзеяў, няма іх крытычнага аналізу. Тэкст падручніку фармальны і безаблічны. Вы не сустрэнеце згадак пра Тадэвушаў Рэйтана ці Касцюшку, Рамана Скірмунта, братоў Луцкевічаў, іншых выбітных дзеячаў беларускай гісторыі. Атрымалася гісторыя без герояў, прадказальна нудная і шэрая[36].

Насамрэч аўтары апынуліся ў складанай сітуацыі: стары пантэон герояў разбураны, а новы не створаны. Ясна, што ў сучаснай палітычнай сітуацыі ў яго могуць трапіць толькі тыя гістарычныя персанажы, дзейнасць якіх задаволіць расійскі бок. Прыклады ўжо ёсць: “Губернатар Міхаіл Мураўёў і нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі” – з такою тэмай у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі выступіў яе дырэктар Вадзім Гігін[37]. У траўні 2024 г. у бібліятэцы высадзіўся дэсант расійскіх даследнікаў,

---

35 Маеўскі Рыгор. Парадоксы акадэмічнага пяцітомніка па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, „Беларускі гістарычны агляд", 21.09.2023: https://www.belhistory.eu/?s=Рыгор+Маеўскі

36 Калядка А. Пустазелле на ніве расійска-беларускай гістарычнай адукацыі // Rocznik Centrum Studiów Białoruskich / Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. № 10. Варшава, 2024. С. 235-244.

37 Фестиваль-лекторий «Цифровая история», Национальная библиотека Беларуси, 20.05.2024: https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/festival-lektoriy-tsifrovaya-istoriya

удзельнікі якога выказалі свой погляд на ключавыя падзеі беларускай гісторыі: Грунвальдскую бітву, бітву пад Воршаю, дзейнасць К. Каліноўскага[38].

Можна не сумнявацца: у стварэнне новага беларускага гістарычнага пантэону расійскія калегі зробяць важкі ўнёсак, бо справа развязаная на самым высокім узроўні. У верасні 2023 г. быў створаны экспертна-кансультатыўны расійска-беларускі савет у справе гісторыі[39].

25 студзеня 2024 г. пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў заявіў, што крызіс сучаснай мадэлі светапарадку справакаваны імкненнем Захаду перапісаць мінулае ў выгадным яму ключы[40]. Дыпламат паведаміў пра стварэнне супольнай расійска-беларускае камісіі ў справе гісторыі для каардынацыі двухбаковых намаганняў, звязаных з ахovаю гістарычнае праўды, у тым ліку адлюстраванай у навучальнай літаратуры.

Ужо ў траўні 2024 г. чальцы савету дамовіліся пра:

- узаемнае рэцэнзаванне расійскіх і беларускіх падручнікаў па гісторыі;
- стварэнне супольных гістарычных часопісаў з пераліку ВАК дзвюх краінаў;
- каардынацыю працы ў справе мемарыялізацыі гістарычнай памяці;
- правядзенне ў 2024–2025 гг. цыклу захадаў пад агульнаю назваю “Год гістарычных паняццяў і тэрмінаў”;
- выданне серыі працаў “Гісторыя для сучаснасці і будучыні”. У межах серыі прадугледжваецца публікацыя выданняў у чатырох кірунках: гістарычныя крыніцы, даследаванні, навучальная і навукова-папулярная літаратура[41].

На трэцім пасяджэнні савету ў лістападзе 2024 г. абмяркоўвалі прынцыпы працы першага расійска-беларускага навукова-практычнага часопісу “Человеческий капитал”, рыхтаванне зборніку “Метадалогія і тэрміналогія гістарычных ведаў: у развіццё расійска-беларускага сацыягуманітарнага ўзаемадзеяння ў XXI ст.” і пытанні мемарыялізацыі агульнай гістарычнай памяці[42].

Як сведчаць аналітычныя запіскі за 2022–2024 гг. аб гістарычнай палітыцы Беларусі, падрыхтаваныя Расійскім інстытутам стратэгічных даследаванняў (РІСД), расійскія чыноўнікі думаюць, што “змешчаная ў беларускіх падручніках і культурна-гістарычных праграмах версія “старой гісторыі” радыкальна разыходзіцца з прынятай у Расіі, працягваючы фармаваць ідэнтычнасць беларусаў на антырасійскіх прынцыпах”[43].

---

38 Спецпроект «Цифровой истории» пройдёт в Концертном зале Национальной библиотеке Беларуси, TIMEPAD: https://tsifrovaya-istoriya.timepad.ru/event/2858277/

39 Меморандум о создании Экспертно-консультативного российско-белорусского Совета по истории / Экспертно-консультативный российско-белорусский Совет по истории, 22.09.2023: https://ecs-hist.ru/bazovye-dokumenty/doc-ecs/4729

40 Посол РФ заявил, что Россия и Белоруссия создают комиссию для защиты исторической правды, ИТАР-ТАСС, 25.01.2024: https://tass.ru/politika/19818849

41 Вместе против фальсификации истории, Вячеслав Данилович в эфире Белорусского радио, Первый национальный канал Белорусского радио, 23.05.2024: https://www.youtube.com/live/viQZJ-5teHs

42 Состоялось Третье заседание Экспертно-консультативного российско-белорусского совета по истории / Экспертно-консультативный российско-белорусский Совет по истории, 24.11.2024: https://ecs-hist.ru/news/event/5304/

43 Гісторыя Беларусі на расійскі капыл / БЮРО, 28.11.2024: https://buromedia.io/be/news/istoriya-belarusi-na-rossiyskiy-lad

Названыя высновы экспертаў звязаныя не толькі са зместам падручнікаў. За апошнія дзесяць гадоў змест беларускіх падручнікаў не стаў больш антырасійскім, аднак ацэнкі экспертаў змяніліся кардынальна. У 2009 г. па замове расійскага фонду “Дзяржаўны клуб” былі прааналізаваныя 187 школьных навучальных дапаможнікаў па гісторыі 12 постсавецкіх краінаў (Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Казахстан, Кыргызстан, Латвія, Літва, Малдова, Узбекістан, Украіна і Эстонія). У 2009-м эксперты прыйшлі да высновы, што ўсе краіны, за выключэннем Беларусі, пайшлі шляхам выкладання маладому пакаленню нацыяналістычнай трактоўкі гісторыі, і толькі ў Беларусі падзеі савецкай гісторыі працягваюць успрымацца як агульныя[44].

Рэзкае ўзмацненне залежнасці рэжыму ў Беларусі ад Расіі пасля 2020 г., пачатак ваенных дзеянняў супраць Украіны прывялі да імкнення прадстаўнікоў расійскай улады ўзмацніць расійскі ўплыў у адукацыйнай прасторы Беларусі. Аналітыкі РІСД прапанавалі адзначаць Дзень еднасці Беларусі з Расіяй 24 кастрычніка 1795 г. Гэта дата трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, які, на іхную думку, знамянуе “аднаўленне гістарычнай еднасці Беларусі з Расіяй”. Для беларусаў з’яўленне такога свята будзе азначаць адмову ад уласнай нацыянальнай версіі гісторыі, вяртання да пастулатаў часу царавання імператрыцы Кацярыны II.

## Высновы

За 30 гадоў кіравання Лукашэнкі праўладныя гісторыкі і прапагандысты так і не здолелі сфармуляваць уласнай ідэалогіі ды пабудаваць гістарычнай канцэпцыі. Узвышэння ролі аднаго чалавека, воляй якога ідзе дождж і каласіцца жыта, аказалася для гэтага недастатковым. Любыя нязручныя факты, што супярэчаць выказванням Лукашэнкі або прыніжаюць дасягненні ягонага рэжыму, вырываюцца з існай гістарычнай канструкцыі. Але ў грамадскай прасторы вакууму не існуе. Пасля 2020 г. расійскі бок рэзка ўзмацніў свае намаганні ва ўніфікацыі гістарычных наратываў Расіі і Беларусі.

Кардынальныя змены адбыліся ў выкладанні гісторыі ў беларускіх ВНУ. Фактычна з навучальнага года 2022/2023 выкладанне айчыннай гісторыі ў якасці асобнай дысцыпліны згорнутае.

У школьных падручніках па гісторыі існуюць значныя прабелы, якія сфармаваліся ў выніку “чысткі” іх зместу ці замоўчвання шэрагу тэмаў.

1. Знік фактар еўрапейскасці Беларусі ў самым шырокім яго разуменні. Уваходжанне беларускіх земляў у склад Рэчы Паспалітай – гэта не толькі пра акаталічванне і паланізацыю, але таксама пра ўдзел мясцовай шляхты ў кіраванні дзяржаваю, развіццё заканадаўчай сістэмы, адукацыйныя магчымасці, усведамленне свайго месца ў коле еўрапейскіх народаў.

44 Освещение общей истории России и народов постсоветских стран в школьных учебниках истории новых независимых государств / Международная некоммерческая ассоциация исследовательских агентств «Евразийский монитор», 2009: https://www.hse.ru/data/2010/07/01/1218886387/doclad_hist_02_light.pdf

2. У беларускім грамадстве не сфармаваны незалежны погляд на падзеі XVII ст. Адсутнічае разуменне, якія мэты пераследавала расійская дзяржава на ўкраінскіх і беларускіх землях падчас вайны 1654–1667 гг., што дазваляе лягчэй замаскаваць захопніцкі характар сучасных дзеянняў расійскай арміі.
3. У выніку русіфікацыі гістарычнай адукацыйнай прасторы пасля 2020 г. найбольш пацярпела XIX стагоддзе: лішнімі аказаліся сведчанні пра ўпартую антырасійскую барацьбу, якая ўвасобілася не толькі ў паўстаннях, а і ў захаванні ідэнтычнасці праз веру, адукацыю, цікавасць да гістарычнай спадчыны.
4. Разам з тэмай антырасійскай барацьбы з беларускіх падручнікаў зніклі імёны яе ўдзельнікаў, якія зрабілі значны ўнёсак у сусветную навуку і культуру: Яна Чэрскага, Канстанціна Ельскага, Бенедыкта Дыбоўскага і інш. Праблема гісторыі без герояў усведамляецца нават сярод праўладных гісторыкаў.
5. Не раскрытая тэма сталінскіх рэпрэсіяў ды іх наступстваў для (неда)развіцця беларускага грамадства. Рэпрэсіі не асэнсаваныя, досвед не засвоены.
6. Інфармацыя пра гісторыю беларускай эміграцыі ў беларускай навучальнай літаратуры адсутнічае ці эпізадычная.
7. Няма асаблівасцяў паўсядзённага жыцця чалавека. Мы мала ведаем пра тое, што елі і пілі нашыя продкі ў розныя гістарычныя эпохі, у якія гульні гулялі, як апраналіся і ўпрыгожваліся, што святкавалі і як аздаблялі жытло.
8. Беспрэцэдэнтнаю з'яваю стаўся выпуск падручнікаў, створаных супрацоўнікамі Генеральнае пракуратуры. Краевугольны камень савецкай спадчыны – гераізацыя Другой сусветнай вайны – даведзены да абсурду. Курс "Мая Радзіма – Беларусь" прадугледжаны з 4-га класу, а выкарыстанне падручніку пра "генацыд беларускага народа" рэкамендаванае з 1-га класу. Такім чынам, вывучэнне гісторыі пачынаецца з ваеннай тэмы, апісання карных аперацыяў і пакутаў беларусаў.
9. Аўтары падручнікаў звязваюць нацыянальную сімволіку з калабарацыянізмам, а дзеянні калабарацыяністаў прыраўноўваюць да дзеянняў нацыстаў. Фактычна падзеі Другой сусветнай вайны выкарыстоўваюцца як фон, неабходны для раскрыцця "злачынстваў" сучасных праціўнікаў рэжыму Лукашэнкі, стварэння "гістарычных падставаў" іхнага крымінальнага пераследу.

# 3. Мілітарызацыя як новы кампанент адукацыйнага і выхаваўчага працэсу

## Вайскова-“патрыятычныя” аб’яднанні: групы, класы, клубы і летнікі

Пасля здушэння хвалі народных пратэстаў 2020 г. імкненне ўладаў Беларусі ўзмацніць кантроль над выхаваннем дзяцей і моладзі вылілася ў небяспечную тэндэнцыю мілітарызацыі выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі. Традыцыйна вядучая роля ў рэалізацыі ідэалагічнай працы адводзілася піянерскай арганізацыі і Саюзу моладзі Беларусі. Пасля 2020-га асноўны акцэнт быў зроблены на ўдзел у выхаваўчым працэсе супрацоўнікаў сілавых ведамстваў.

**Вайскова-спартовыя летнікі**

Вайскова-спартовыя летнікі існавалі ў Беларусі ў савецкі час: завяршэнне праграмы пачатковай вайсковай падрыхтоўкі прадугледжвала ўдзел школьнікаў у зборах у вайсковых частках, дзе пад кіраўніцтвам кадравых вайскоўцаў яны знаёміліся з побытам, узорамі ўзбраення, капалі акопы, займаліся элементамі страявой, агнявой, фізічнай і медычнай падрыхтоўкі.

Частковае вяртанне да савецкай практыкі адбылося пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 г., якія завяршыліся масавымі народнымі выступленнямі супраць фальсіфікацыі іх вынікаў. Палажэнне аб выхаваўча-аздараўленчай установе адукацыі за 19 ліпеня 2011 г.[1] рэгламентавала дзейнасць дзіцячых вайскова-“патрыятычных” летнікаў. Дакумент замацоўваў іх утварэнне ва ўзаемадзеянні з міністэрствамі абароны, унутраных справаў, надзвычайных сітуацыяў, Дзяржаўным памежным камітэтам.

Першапачаткова дзіцячыя летнікі вайскова-“патрыятычнага” тыпу працавалі толькі ў дзённым фармаце. Паступова іх пачалі ператвараць у кругладзённыя: з казарменным распарадкам дня, вайсковаю культурай і дысцыплінай. Асабліва гэтая тэндэнцыя ўзмацнілася пасля ўварвання Расіі ва Украіну ў лютым 2022 г.

Паводле афіцыйных асобаў, на тэрыторыі Беларусі ўлетку 2022-га былі арганізаваныя 480 вайскова-“патрыятычных” летнікаў, у якіх прайшлі аздараўленне больш за 18 тыс. няпоўнагадовых[2]. Улічваючы агульную колькасць дзяцей у Беларусі на дзень 1 студзеня 2022 г., 1,848 млн, Міжнародны цэнтр грамадзянскіх ініцыятываў “Наш дом” прыйшоў да высновы, што кожны 55-ты няпоўнагадовы ў Беларусі прайшоў праз летнік, дзе, акрамя навучання асновам вайсковае службы, падлеткам

1 Постановление Министерства Образования Республики Беларусь 19 июля 2011 г. № 89 Об утверждении Положения о воспитательно-оздоровительном учреждении образования / Мир права: http://world_of_law.pravo.by/text.asp?RN=W21124351

2 В Беларуси в летний период организовали 480 военно-патриотрических лагерей / БелТА, 29.08.2022: https://belta.by/society/view/v-belarusi-v-letnij-period-organizovali-480-voenno-patrioticheskih-lagerej-520967-2022/

навязвалася ідэалогія “русского мира”, яго гістарычныя і культурныя наратывы[3].

Падчас летняй аздараўленчай кампаніі 2023 г. ва ўзаемадзеянні з воінскімі часткамі і сілавымі ведамствамі функцыянавалі 736 летнікаў вайскова-“патрыятычнага” профілю, у якіх “аздаравіліся” амаль 27 тыс. дзяцей[4]. Работніца Міністэрства адукацыі Таццяна Асмалоўская падкрэсліла поспехі падначаленых, бо ў 2022 г. летнікаў было “толькі 583”, а дзяцей у іх каля 21 тыс. Калі параўнаць гэтыя звесткі з лічбамі вышэй, то відавочна, што ў названай сферы назіраюцца значныя прыпіскі ці чыноўнікі змянілі методыку падліку вайскова-“патрыятычных” летнікаў за гады іх існавання.

У цэлым беларускія аздараўленчыя летнікі паступова набываюць ваенізаваныя рысы, дзе праводзяцца захады, рэалізацыя якіх да 2020 г. здавалася цалкам несумяшчальнаю з выхаваўчым працэсам. У дзіцячым цэнтры “Зубраня” адкрылі адзіны мемарыяльны куток памяці героя Беларусі Мікіты Куканенкі і героя Расійскай Федэрацыі Аляксандра Крыніна. Мікіта Куканенка – адзін з пілотаў самалёта, які 19 траўня 2021 г. разбіўся каля Баранавічаў. Разам з Андрэем Нічыпорчыкам яны адвялі самалёт ад жылых будынкаў, за што пасмяротна атрымалі званні герояў Беларусі. Што датычыць Аляксандра Крыніна, то ён ваяваў на тэрыторыі Харкаўскай вобласці і атрымаў званне за ўдзел у ваеннай агрэсіі супраць Украіны. Такім чынам, у лагеры зраўнялі памяць расійскага вайскоўца, які загінуў у захопніцкай вайне супраць Украіны, з беларускім лётчыкам, які ўратаваў нявінных людзей цаною ўласнага жыцця[5].

У тым жа цэнтры “Зубраня” зарганізавалі “дзелавую гульню” – “Суд над экстрэмізмам”. Падчас гульні дзеці выконвалі ролі суддзі, сакратара, пракурора, адваката, сведкаў, пацярпелых, экспертаў, прысяжных засядацеляў і вынеслі абвінаваўчы прысуд праціўнікам існага ў Беларусі рэжыму[6].

### Вайскова-“патрыятычныя” клубы

Імкненне ахапіць вайскова-“патрыятычнаю” працай як мага шырэйшыя колы навучэнцаў прывяло да развіцця сістэмы вайскова-“патрыятычных” клубаў. У адрозненне ад сезонных летнікаў, яны працуюць круглы год. Прававыя асновы дзейнасці клубаў былі закладзеныя распараджэннем “Аб некаторых захадах у справе патрыятычнага выхавання моладзі” за 2 снежня 1997 г.[7] Сапраўдны бум у дзейнасці

3 Милитаризация детей в Беларуси и подготовка детей к участию в военных действиях на стороне России / НАШ ДОМ, 2022.09.05: https://nash-dom.info/95506

4 Мінадукацыі расказала пра працу з Мінабароны па патрыятычным выхаванні моладзі / БЕЛТА, 05.02.2024: https://blr.belta.by/society/view/minadukatsyi-raskazala-ab-rabotse-z-minabarony-pa-patryjatychnym-vyhavanni-moladzi-127582-2024/

5 У лагеры «Зубраня» адкрылі куток памяці расіяніна, які загінуў на імперыялістычнай вайне ва Украіне / Наша Ніва, 28.09.2022: https://nashaniva.com/300126

6 У лагеры «Зубраня» для дзяцей арганізавалі гульню «Суд над экстрэмізмам» / Наша Ніва, 06.12.2023: https://nashaniva.com/331624

7 Распоряжение Президента Республики Беларусь «О некоторых мерах по патриотическому воспитанию молодежи» от 2 декабря 1997 г. № 365 ЭТАЛОН ONLINE: https://etalonline.by/document/?regnum=c29801126

Падчас дзелавой гульні
“Суд над экстрэмізмам”
у дзіцячым цэнтры “Зубраня”.

Фота: zubronok.by




названых арганізацыяў адбыўся пасля падпісання ў траўні 2022 г. указу[8], які дазваляў ствараць клубы ў вайсковых частках, што здымала з установаў адукацыі праблемы іх фінансавання. З верасня 2024 г. дазволена таксама ствараць вайскова-“патрыятычныя” клубы на базе органаў унутраных справаў[9]. Заняткі ў клубах уключаюць страявую і фізічную падрыхтоўкі, рукапашны бой, навучанне карыстацца агнястрэльнаю зброяй, асновы медычнай падрыхтоўкі, ідэалагічнае выхаванне.

Першы вайскова-“патрыятычны” клуб – “Рысь” – адкрыўся ў кастрычніку 2021 г. на базе мінскай вайсковай часткі 3214. На адкрыцці прысутнічаў камандуючы ўнутранымі войскамі Мікалай Карпянкоў, які асабіста браў удзел у разгонах мірных дэманстрацыяў 2020 г.[10]

Падчас адкрыцця клубу дзеяла выстава стралковай зброі і рыштунку спецпадраздзяленняў. Школьнікі маглі трымаць у руках снайперскую вінтоўку, аўтамат Калашнікава, гранатамёт, прымерыць шалом ці браняваную камізэльку.

У студзені 2023 г. “Рысь” стаўся лаўрэатам прэміі “За духоўнае адраджэнне”[11]. Як у клубе разумеюць выхаванне патрыятызму, можна ўбачыць у фільме АТН: выхаванцам “Рысі” дэманструюць прапагандысцкае відэа з Расіі, дзе хлопчык у вайсковай уніформе пры з’яўленні калоны вайсковай тэхнікі выбягае прывітаць салдатаў. Тэхніка, зразумела, з літараю Z[12]. На занятках выхаванцы працуюць са зброяй і беспілотнікамі[13].

---

8 Указ “О развитии военно-патриотических клубов” № 160 от 4 мая 2022 г. / Президент Республики Беларусь, 04.05.2022 г.: https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-no-160-ot-4-maya-2022-g

9 Указ № 353 ад 9 верасня 2024 г. / Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, 09.09.2024: https://president.gov.by/be/documents/ukaz-no-353-ad-9-verasna-2024-g

10 Городской военно-патриотический клуб «Рысь» открылся на базе части 3214 внутренних войск МВД / МИНСК НОВОСТИ, 02.10.2021: https://minsknews.by/gorodskoj-voenno-patrioticheskij-klub-rys-otkrylsya-na-baze-chasti-3214-vnutrennih-vojsk-mvd/

11 Основы рукопашного боя и огневой подготовки. Узнали, какую школу проходят дети в патриотическом клубе «Рысь» / МИНСК НОВОСТИ, 11.02.2023: https://minsknews.by/osnovy-rukopashnogo-boya-i-ognevoj-podgotovki-uznali-kakuyu-shkolu-prohodyat-deti-v-patrioticheskom-klube-rys/

12 Милитаризация детей в Беларуси и подготовка детей к участию в военных действиях на стороне России / НАШ ДОМ, 2022.09.05: https://nash-dom.info/95506

13 Как попасть в военно-патриотический клуб, и чем там занимаются / МИНСК НОВОСТИ 16.08.2024: https://minsknews.by/kak-popast-v-voenno-patrioticheskij-klub-i-chem-tam-zanimayutsya/

Каардынацыйны цэнтр вайскова-“патрыятычных” клубаў у Беларусі – Моладзевы “патрыятычны” цэнтр, створаны на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. Цяпер будуецца Рэспубліканскі цэнтр “патрыятычнага” выхавання моладзі. У красавіку 2022 г. Моладзевы “патрыятычны” цэнтр наведалі прадстаўнікі дэлегацыі Чачэнскай Рэспублікі Расійскай Федэрацыі. У межах сустрэчы былі дасягнутыя дамоўленасці пра развіццё супрацы дзіцячых і моладзевых патрыятычных клубаў[14].

Дасягненні ў працы вайскова-“патрыятычных” клубаў можна ўбачыць падчас арганізаваных для падлеткаў спаборніцтваў. Гэтак, навучэнцы смаргонскай гімназіі атрымалі дыплом 2-й ступені ў злёце вайскова-“патрыятычных” клубаў органаў памежнай службы “Юная мяжа”. Цэлы дзень дзеці правялі ў вайсковай уніформе ў вайсковай частцы 2044. Яны бралі ўдзел у конкурсе “Мы – юныя памежнікі!”, аглядзе строю і конкурсе песні “Дысцыпліна і згуртаванасць”[15]. У той жа час вы не знойдзеце на сайце гімназіі згадак пра 260-годдзе з дня нараджэння Міхала Агінскага ў 2025 г. ці 210-годдзе Габрыелі Пузыны (сядзібы абаіх былі ў межах сучаснай Смаргоншчыны). Відаць, знаёмства з дзейнасцю гэтых гістарычных асобаў развіццю патрыятызму падлеткаў не спрыяе.

Інфармацыя пра колькасць вайскова-“патрыятычных” клубаў у Беларусі носіць супярэчлівы характар. У снежні 2024 г. у эфіры праграмы “24 часа” СТВ начальнік упраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства ўнутраных справаў Антон Санкевіч заявіў, што пад эгідаю МУС дзейнічае каля 160 вайскова-“патрыятычных” клубаў, у складзе якіх – больш за 5,5 тыс. дзяцей[16].

Аднак яшчэ ў сакавіку 2024 г. “Еўрарадыё” паведаміла, што ў Беларусі могуць існаваць больш за 900 вайскова-“патрыятычных” клубаў, бо неабходна ўлічваць клубы, прыпісаныя да міністэрстваў надзвычайных сітуацыяў і абароны, Памежнага камітэту ды іншых ведамстваў[17]. Публікацыя спасылалася на тэлеграм-канал “МотолькоПомоги”. У сваю чаргу тэлеграм-канал спасылаўся на даследаванне экспертаў маніторынгавай групы iSANS (International Strategic Action Network for Security). Аднак аналіз матэрыялаў маніторынгу не пацвярджае гэтай інфармацыі[18].

Вольнае жангляванне лічбамі, распаўсюд неправеранай інфармацыі перашкаджаюць рэальнаму аналізу праблемы колькасці і наступстваў дзейнасці паўваенных фармаванняў сярод падлеткаў.

---

14 Там жа.

15 Злёт ваенна-патрыятычных клубаў органаў пагранічнай службы “Юная мяжа” / Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія г. Смаргоні”: https://gimnazia.smorgon-edu.gov.by/

16 В Беларуси растет количество военно-патриотических клубов / СТВ, 20 декабря 2024: https://ctv.by/news/obshestvo/v-belarusi-rastet-kolichestvo-voenno-patrioticheskih-klubov

17 В Беларуси может быть уже более 900 “военно-патриотических клубов” / Еврорадио, 06.03.2024: https://euroradio.fm/ru/v-belarusi-mozhet-byt-uzhe-bolee-900-voenno-patrioticheskikh-klubov

18 Образование: Мониторинг / iSANS: https://isans.org/ru/education/education-monitoring/

**Вайскова-“патрыятычныя” класы і групы**

У верасні 2021 г. у навучальных установах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь увялі пасаду кіраўніка вайскова-“патрыятычнага” выхавання. Ён павінен каардынаваць працу ўстановы ў названым кірунку, узаемадзеяць з вайсковымі камісарыятамі і воінскімі часткамі, фармаваць у вучняў любоў і адданасць радзіме[19]. У сакавіку 2023 г. укамплектаванасць кіраўнікамі вайскова-“патрыятычнага” выхавання школаў Беларусі складала 93 %[20]. У красавіку 2023 г. міністр адукацыі Андрэй Іванец заклікаў не абмяжоўвацца 5 днямі на тыдзень і зрабіць суботы днямі “патрыятычнага выхавання” ў школах[21].

Нізавая ступень вайскова-“патрыятычнага” выхавання – вайскова-“патрыятычныя” класы і групы. Яны практычна не адрозніваюцца паміж сабою. Напрыклад, у навучальным годзе 2024/2025 у невялікай СШ №2 Ляхавічаў функцыянавалі дзве групы вайскова-“патрыятычнага” кірунку: на базе 10 А класу – 7 чалавек і на базе 11 А класу – 11 чалавек[22]. Не варта думаць, што дзейнасць школьных арганізацыяў носіць больш міралюбны характар, чым летнікаў і клубаў, зарганізаваных з удзелам сілавых ведамстваў. Толькі ў 2023 г. Міністэрства абароны перадало ўстановам агульнай сярэдняй адукацыі 32 макеты аўтаматаў Калашнікава, амаль 4 тыс. супрацьгазаў, больш за 2,5 тыс. камплектаў ахоўных строяў, а таксама плашч-палаткі, шаломы, сапёрныя і пяхотныя рыдлёўкі, санітарныя і палявыя сумкі, падсумкі для гранатаў і магазінаў ды іншае[23]. Міністэрства адукацыі закупіла для школаў 191 мультымедыйны навучальны трэнажор для правядзення стрэльбаў. Школьны цір – новы трэнд у патрыятычным выхаванні беларускай моладзі[24].

Што датычыць колькасці вайскова-“патрыятычных” класаў у беларускіх школах, то інфармацыя Міністэрства адукацыі супярэчыць звесткам Міністэрства абароны. Паводле даных Міністэрства адукацыі, у студзені 2024 г. 220 установаў агульнай сярэдняй адукацыі мелі профільныя класы вайскова-“патрыятычнага” кірунку[25]. Паводле звестак Міністэрства абароны за лістапад 2024 г., у Беларусі налічваліся 155 вайскова-“патрыятычных” класаў[26].

---

19 Как ведется работа по патриотическому воспитанию в школах. На примере одного учреждения образования / Детский правовой сайт, 13.05.2023: https://mir.pravo.by/news/different/kak-vedetsya-rabota-po-patrioticheskomu-vospitaniyu-v-shkolakh-na-primere-odnogo-uchrezhdeniya-obraz/

20 Укомплектованность руководителями военно-патриотического воспитания школ Беларуси составляет 93% / БЕЛТА, 09.03.2023: https://belta.by/society/view/ukomplektovannost-rukovoditeljami-voenno-patrioticheskogo-vospitanija-shkol-belarusi-sostavljaet-93-554398-2023/

21 Министерство образования Беларуси пересмотрит рекомендации по проведению шестого школьного дня. Об этом сообщил министр образования Андрей Иванец во время рабочей поездки в Брест / БЕЛТА, 08.04.2022: https://belta.by/society/view/minobrazovanija-peresmotrit-rekomendatsii-po-shestomu-shkolnomu-dnju-495003-2022/

22 Профильная группа военно-патриотической направленности / ГУО “Средняя школа №2” Ляховичи: http://sch2.lyahovichi.edu.by/ru/main.aspx?guid=138211

23 Мінадукацыі расказала пра працу з Мінабароны па патрыятычным выхаванні моладзі / БелТА, 05.02.2024: https://blr.belta.by/society/view/minadukatsyi-raskazala-ab-rabotse-z-minabarony-pa-patryjatychnym-vyhavanni-moladzi-127582-2024/

24 Школьны цір — новы трэнд у патрыятычным выхаванні, Андрэй Калачоў / Наша Ніва, 02.12.2023: https://nashaniva.com/331277

25 Приоритетные направления военно-патриотического воспитания / БелТА, 29.01.2024: https://belta.by/roundtable/view/prioritetnye-napravlenija-voenno-patrioticheskogo-vospitanija-detej-i-molodezhi-v-uchrezhdenijah-obrazovanija-1591/

26 Минобороны: в Беларуси открыто 155 военно-патриотических классов / Детский правовой сайт, 21 ноября 2024: https://mir.pravo.by/news/different/minoborony-v-belarusi-otkryto-155-voenno-patrioticheskikh-klassov/

Відавочна, кожнае ведамства імкнецца найбольш удала прэзентаваць свой унёсак у справу “патрыятычнага выхавання” беларускай моладзі, распрацоўваючы найбольш выгадныя для сябе методыкі падліку. Пагатоў кіраўніцтва паставіла перад падначаленымі задачу стварыць вайскова-“патрыятычныя” групы ў кожнай школе[27]. Магчыма, Міністэрства адукацыі ў адну графу ўключае патрыятычныя класы і групы. Цяжкаадсочвальныя “групы” даюць шырокі простор для сталага павелічэння справаздачных паказнікаў.

Новая грань мілітарызацыі беларускіх школьнікаў заключаецца ў скіраванні вучняў старэйшых класаў замест летняй вытворчай практыкі ў вайсковыя часткі. Пры гэтым адмовіцца ад удзелу ў гэтых нерэгламентаваных законам вайсковых зборах немагчыма[28].

У студзені 2024 г. Міністэрства адукацыі Беларусі апублікавала навучальную праграму новага факультатыўнага курсу “Вайсковы пераклад” для вучняў 10-х і 11-х класаў. Курс скіраваны на развіццё магчымасцяў вучняў перакладаць “размовы ці допыты ваеннапалонных”, а таксама “вызначаць званні і катэгорыі вайскоўцаў арміяў ЗША і Вялікай Брытаніі”[29].

Тэндэнцыя залучэння дзяцей у сістэму вайскова-“патрыятычных” захадаў не абышла нават установы дашкольнай адукацыі. Пасля таго як у красавіку 2023 г. старшыня Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава наведала патрыятычны цэнтр у дзіцячым садку № 6 Фаніпалю і выказалася на падтрыманне такога віду работы з дзецьмі 3–4 гадоў[30], аналагічныя цэнтры пачалі ствараццa па ўсёй рэспубліцы. Малых запрашаюць у сапраўдныя вайсковыя часткі. У прыватнасці на дні адчыненых дзвярэй вайскавой часткі 7434 у Астраўцы ганаровымі гасцямі былі выхаванцы дзіцячага садку №5. Яны атрымалі магчымасць убачыць жыццё вайскоўцаў і патрымаць у руках зброю. Дзіцячы садок нават пашыў юнармейскую ўніформу для сваіх выхаванцаў[31].

Рэгулярнаю практыкаю сталася правядзенне ў дзіцячых садках 23 лютага спаборніцтваў, якія імітуюць баявыя дзеянні, дзе выкарыстоўваецца адпаведны рэквізіт – насілкі, фуражкі, уніформа. Адзначым два аспекты такіх захадаў:

27 Иванец: в каждой школе к концу учебного года должен появиться военно-патриотический класс или клуб / БЕЛТА, 26.10.2023: https://belta.by/society/view/ivanets-v-kazhdoj-shkole-k-kontsu-uchebnogo-goda-dolzhen-pojavitsja-voenno-patrioticheskij-klass-ili-596234-2023/

28 Хроники милитаризации РБ: из-за школьной парты – прямиком на полигон / НАШ ДОМ, 08.06.2023: https://nash-dom.info/115247

29 Постановление Министерства образования Республики Беларусь 29 сентября 2023 г. № 313 «Об утверждении учебных программ факультативных занятий» / Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 16.01.2024: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340798p

30 «Кто-то говорит, что в 3–4 года еще рано, а я считаю, не рано». Кочановой показали «патриотический центр» в детсаде / ЗЕРКАЛО, 26.04.2023: https://news.zerkalo.io/life/37727.html

31 Оружие в детских руках: милитаризация дошкольников в Беларуси как часть государственной политики, Олег Борщевский / НАШ ДОМ, 2024.11.16: https://nash-dom.info/117307

- на меркаванне псіхолагаў, успрыманне дзецьмі зброі ў якасці чагосьці прывабнага і цікавага закладае ў іх небяспечнае стаўленне да гвалту як да нормы;
- бацькі часта не ведаюць пра канкрэтны змест “патрыятычных акцыяў”, у якіх бяруць удзел іхныя дзеці.

## Рэалізацыя выхаваўчых захадаў сіламі супрацоўнікаў сілавых ведамстваў, выязныя суды

Удзел супрацоўнікаў сілавых ведамстваў у выхаваўчых захадах адукацыйных установаў Рэспублiцы Беларусь ператварылася ў звычайную практыку. Аналіз сацыяльных сетак сілавых ведамстваў дэманструе найбольшую актыўнасць у гэтым кірунку супрацоўнікаў пракуратуры. Нават напярэдадні Калядаў і Новага году яны наведваюць дзіцячыя ўстановы для правядзення ідэалагічных захадаў. Напрыклад, 30 снежня 2024 г. супрацоўнікі Баранавіцкай пракуратуры наведалі баранавіцкі дзіцячы садок № 40[32].

У мінскім філіяле Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэту ў пачатку снежня 2023 г. выступіў удзельнік “спецыяльнай вайсковай аперацыі” Аляксандр Пылкоў[33].

Апагеем цынізму выглядаюць “выхаваўчыя захады” супрацоўнікаў сілавых ведамстваў[34] беспасярэдне пасля арыштаў студэнтаў[35]. Падчас такіх сустрэчаў прапагандысты паўтараюць гістарычныя міфы пра “генацыд беларускага народу ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, “этнацыд беларусаў” у Рэчы Паспалітай, польскае паходжанне Каліноўскага ды інш. Гучаць прапагандысцкія клішэ ў ацэнцы сучасных падзеяў: “неанацысцкі рэжым ва Украіне”, “генацыд мірнага насельніцтва на Данбасе”, “спецыяльная вайсковая аперацыя для дэнацыфікацыі Украіны”[36].

Практыка правядзення ва ўстановах адукацыі выязных судовых пасяджэнняў цынічна называецца “аптымальным варыянтам спалучэння тэарэтычнай падрыхтоўкі і практыка-арыентаванага навучання”[37].

32 Генеральная прокуратура Республики Беларусь / ВКонтакте, 30.12.2024: https://vk.com/wall-162326562_10305

33 Перад студэнтамі мінскага ВНУ выступіў «герой СВА». Аказалася, што гэта прафесійны «ряженый» / Наша Ніва, 17.12.2023: https://nashaniva.com/332388/

34 «Калі трапіце ў поле зроку, вас знойдуць». Сілавікі прачыталі «лекцыю» брэсцкім студэнтам, на якіх нядаўна ўчынілі аблаву / Наша Ніва, 12.12.2023: https://nashaniva.com/332058/

35 «Гэта быў сапраўдны трэш. Яны ўрываліся ў пакоі, патрабавалі ў нас тэлефоны, перакульвалі ўсё ўверх дном» / Наша Ніва, 07.12.2023: https://nashaniva.com/331745

36 «Падобна да цырку, толькі не трэба плаціць за білеты». Студэнты расказалі, як праходзяць «Зачётные разговоры» з прапагандыстамі / Зеркало, 28.03.2023: https://news.zerkalo.io/life/35576.html

37 Оптимальный вариант сочетания теоретической подготовки и практикоориентированности обучения: в Академии управления прошло выездное заседание суда Октябрьского района г.Минска / Академию управления при Президенте Республики Беларусь, 05.07.2024: https://www.pac.by/press-center/news/optimalniy-variant-sochetaniya-teoreticheskoi-podgotovki-i-praktikoorientirovannosti-obucheniya-v-akademii-upravleniya-proshlo-zasedaniye-suda/

На рэгулярнай аснове выязныя пасяджэнні праводзяцца ў беларускіх сярэдніх спецыяльных навучальных установах[38] і ВНУ[39].

На працягу 2020–2024 гг. у Беларусі склалася новая практыка запалохвання навучэнцаў і выкладнікаў – арышт на працоўным месцы ці месцы навучання. Увосень 2020-га сілавікі пачалі затрымліваць студэнтаў у сценах універсітэтаў[40], потым гэтая практыка распаўсюдзілася на выкладнікаў і рэгулярна працягвалася ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, што зафіксавана ў маніторынгах iSANS[41].

Практыка закранула выкладнікаў пачатковай[42], агульнаадукацыйнай[43] і вышэйшай школаў[44]. З цягам часу абвінавачанні рабіліся ўсё больш абсурднымі. Гэтак, Брэсцкі абласны суд асудзіў выкладніка вайсковага факультэту БДУ Дзмітрыя Пазнякова на 19 гадоў калоніі паводле арт. 356 КК "Здрада дзяржаве"[45]. Паводле "Вясны", Дзмітрыя катавалі ў калоніі, выкарыстоўваючы электрашокер, каб прымусіць падпісаць пустыя аркушы[46].

Ва ўніверсітэце ў студзені 2023 г. за публікацыю вынікаў свайго навуковага даследавання "Перадумовы беларускага пратэсту ў 2020 годзе" затрымалі прафесара Юрыя Бубнава[47]. У сваёй працы навуковец прыйшоў да высновы, што пратэстоўцаў у 2020 г. аб'яднаў не нейкі "закулісны лялькавод", а Аляксандр Лукашэнка. Фактычна суд Кастрычніцкага раёну Магілёва асудзіў навукоўца за іншадумства, вырак – 2 гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Незалежныя даследаванні ў такіх умовах немагчымыя.

---

38 В колледже прошло открытое выездное судебное заседание / УО "Жлобинский государственный технологический колледж", 06.03.2024: https://zgptk.byВ колледже состоялось выездное заседание суда Ленинского района г. Бреста / УО "Брестский государственный медицинский колледж", 26.03.2024: https://medicalbrest.by/v-kolledzhe-sostoyalos-vyezdnoe-zased/
Выездное заседание суда / Барановичский государственный колледж машиностроения, 18.09.2024: https://bgkm.brest.by/index.php?option=com_content&view=frontpage&limitstart=80 Открытое выездное заседание суда / УО "Юридический колледж Белорусского государственного университета, 04.01.2025: http://www.lawcollege.bsu.by/novosti/1613-otkrytoe-vyezdnoe-zasedanie-suda.html#

39 Открытое выездное судебное заседание / Белорусский государственный университет транспорта, 24.10.2024: https://www.bsut.by/news/16803-otkrytoe-vyezdnoe-sudebnoe-zasedanie
В МИТСО состоялось выездное открытое заседание суда / Международный университет МИТСО, 01.03.2024: https://www.mitso.by/ru/universitet/news/v-mitso-sostoyalos-vyezdnoe-otkrytoe-zasedanie-suda.html
В БНТУ прошло открытое выездное заседание суда / TIMES.BNTU.BY, 03.11.2022: https://bntu.by/be/news/11949-otkrytoe-vyezdnoe-zasedanie-suda
Выездное судебное заседание на факультете экономики и права / Могилевский государственный университет имени А.А, Кулешова, 04.05.2024: https://msu.by/novosti/univernews/4733-2024-03-04-1

40 Пели "Марсельезу" и "Перемен": в Минске силовики задержали студентов прямо в холле университета / Бабель, 04.09.2020: https://babel.ua/ru/news/50572-peli-marselezu-i-peremen-v-minske-siloviki-zaderzhali-studentov-pryamo-v-holle-universiteta

41 https://isans.org/ru/education/education-monitoring/

42 Учителя начальных классов задержали прямо на уроке / Салідарнасць, 04.05.2023: https://gazetaby.com/post/plyus-pyat-politzaklyuchennyx/191187/?inf_scroll=1

43 В белорусской школе учительницу задержали прямо на уроке / LIFE, 13.04.2023: https://life.ru/p/1572031

44 "У рукі сілавікоў мяне перадала намесніца дэкана". Пагаварылі з экс-выкладчыцай БДУ, якую затрымлівалі проста ва ўніверсітэце / Зеркало, 11.09.2023: https://news.zerkalo.io/life/48566.html

45 Спецслужбы Польши вербуют белорусов! Как это происходит на практике: задания, суммы и последствия / NEWS.BY: новости Беларуси и мира, 03.12.2024: https://www.youtube.com/watch?v=xGWofQ1PPKk

46 https://prisoners.spring96.org/ru/person/dzmitryi-paznjakou

47 Доктора наук из Могилева Юрия Бубнова отправили за решетку на два года. Все из-за статьи в научном журнале / MAYDAY.TEAM, 27.05.2023: https://t.me/MAYDAYMog/3339

## Прасоўванне ідэалогіі “русского мира” і культу асобы Аляксандра Лукашэнкі

У межах ідэалагічнай работы ў беларускіх установах адукацыі актыўна прасоўваецца ідэалогія “русского мира”. На падставе рэгулярных маніторынгаў за 2023–2024 гг. можна вызначыць асноўныя кірункі яе распаўсюду ў сферы адукацыі.

1. Узмацненне працэсу ўніфікацыі і збліжэння заканадаўства дзвюх краінаў у галіне моладзевай палітыкі і адукацыі.

У межах інтэграцыі ў фармаце Саюзнай дзяржавы дзве краіны працуюць над аб’яднаннем адукацыйнай прасторы. На сёння Расія арганізуе беларускім абітурыентам найбольшыя ў СНД квоты на навучанне за кошт расійскага бюджэту. У навучальным годзе 2023/2024 беларускай моладзі вылучылі 1,3 тыс. бюджэтных месцаў[48]. Адначасова ў Беларусі праводзяцца захады для абмежавання доступу грамадзянаў да еўрапейскай адукацыі. Бенефіцыярам такіх дзеянняў робяцца расійскія ўніверсітэты, якія атрымліваюць магчымасць пераарыентаваць на сябе плынь беларускіх абітурыентаў[49].

У снежні 2020 г. стварылі Асацыяцыю школаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь[50]. У траўні 2024-га на супольнай калегіі Міністэрства адукацыі Беларусі і Міністэрства асветы Расійскай Федэрацыі пастанавілі стварыць Асацыяцыю каледжаў Расіі і Беларусі. На калегіі вызначалі прыярытэтныя кірункі супрацы ў сферы адукацыі: праграмы вучнёўскага абмену, абмен выкладнікаў досведам, пашырэнне дзейнасці Асацыяцыі школаў Расіі і Беларусі ды інш.

Варта адзначыць удзел у “абмене досведам” чальцоў расійскіх узброеных фармаванняў. У лютым 2024 г. намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь Андрэй Жук паведаміў, што чальцы “Групы Вагнэра” навучаюць выкладнікаў ведамасных навучальных установаў[51].

2. Вызначэнне дзейнасці ў сферы адукацыі ў якасці прыярытэтнай у працы прарасійскіх арганізацыяў.

Названая дзейнасць маштабуецца ў розных кірунках (праца з настаўнікамі школаў, выкладнікамі ВНУ, абітурыентамі, студэнтамі, моладдзю ў цэлым). Традыцыйна пік удзелу беларускіх навучэнцаў у прарасійскіх захадах прыпадае на перыяд святкавання Дня Перамогі. Толькі ў траўні 2024 г. быў зафіксаваны ўдзел беларусаў больш як у 50 акцыях прарасійскіх арганізацыяў і расійскіх / саюзных праектах[52].

---

48 Россия и Беларусь идут к формированию единой образовательной системы / ЕВРАZИЯ ЭКСПЕРТ, 30.08.2024: https://eurasia.expert/rossiya-i-belarus-idut-k-formirovaniyu-edinoy-obrazovatelnoy-sistemy/

49 Политика властей Беларуси по ограничению доступа белорусов к европейскому образованию / iSANS, 29.01.2024: https://isans.org/wp-content/uploads/2024/01/1-ogranichenie_dostupa_k_evropejskomu_obrazovaniyu-1.pdf

50 Официальный сайт Ассоциации школ Российской Федерации и Республики Беларусь: https://asrfrb.ru/ob-associaczii/

51 Как совершенствуется боевая подготовка военных – рассказал заместитель министра обороны Андрей Жук / СБ. Беларусь сегодня, 29.02.2024: https://www.sb.by/articles/kak-sovershenstvuetsya-boevaya-podgotovka-voennykh-rasskazal-zamestitel-ministra-oborony-andrey-zhuk.html

52 Белорусское образование и российское присутствие в нем. Общие тенденции мая / iSANS, 10.06.2024: https://isans.org/wp-content/uploads/2024/06/maj-2024-vneshnee-vliyanie.pdf

У кастрычніку 2023 г. на базе Рускага Дому ў Мінску адкрылі Цэнтр адкрытай адукацыі Міністэрства адукацыі Расійскай Федэрацыі.

3. Рэалізацыя захадаў, у якіх разам з беларускімі навучэнцамі і педагогамі бяруць удзел прадстаўнікі адукацыйных установаў так званых ЛНР і ДНР.

Тэматыка такіх захадаў вельмі разнастайная: ад акцыяў ліставання паміж школьнікамі да ўшанавання памяці баевікоў-сепаратыстаў. Гэтак, у лістападзе 2023 г. прадстаўнікі Моладзевага парламенту пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь узялі ўдзел у круглым стале Данецкага дзяржаўнага ўніверсітэту на тэму "Асаблівасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі: новыя выклікі ва ўмовах правядзення СВА". Падчас паездкі прадстаўнікі беларускай дэлегацыі ўскладалі кветкі да месца гібелі першага кіраўніка ДНР Аляксандра Захарчанкі, помнікаў вядомых сепаратыстаў Гіві, Матаролы, Мамая, Корсы ды інш.

У сакавіку 2024 г. беларускія студэнты і навучэнцы масава адправіліся на "Сусветны фестываль моладзі" ў Сочы, дзе акрамя расійскіх чыноўнікаў і прапагандыстаў выступалі прадстаўнікі так званых Абхазіі і ДНР. Беларуская дэлегацыя на фестывалі налічвала 630 чалавек, у тым ліку каля 120 прадстаўнікоў сферы адукацыі. Названыя захады спрыяюць фармаванню ўяўлення, што Данецкая і Луганская вобласці Украіны – тэрыторыя Расіі.

Эксперты[53] і журналісты[54] прыходзяць да высновы пра фармаванне ў Беларусі культу асобы Аляксандра Лукашэнкі, які насаджваецца ў тым ліку ў сферы адукацыі. Выхаваўчыя захады ва ўстановах адукацыі ўключаюць праслаўленне прэзідэнта як чалавека, надзеленага звышздольнасцямі, які дорыць дзецям новыя школы, лядовыя палацы, басейны, а разам з тым мірнае неба і шчаслівае дзяцінства. Любыя магчымасці, якія адкрываюцца перад дзецьмі і моладдзю, падаюцца як падарунак Лукашэнкі. Звычайныя планавыя захады ператвараюцца ў праслаўленне ягонай асобы. Гэтак, у траўні 2024 г. падчас правядзення апошняга званка ў Ліцэі БДУ былі адкрытыя адразу дзве памятныя таблічкі ў гонар Лукашэнкі[55].

Найбольш небяспечныя тэндэнцыі праслаўлення прэзідэнта прасочваюцца сярод выхаванцаў вайскова-"патрыятычных" класаў і клубаў. У кастрычніку 2023 г. кадэтаў такога класу Мухавецкай сярэдняй школы Брэсцкай вобласці выстраілі на "Алеі памяці" побач з вялікім фотаздымкам Лукашэнкі і запісалі віншаванне: "З Днём бацькі, наш прэзідэнце!" У відэазвароце Лукашэнку называюць бацькам усёй краіны, выкарыстоўваюць ягоныя фотаздымкі з сынамі[56].

---

53 Как Лукашенко строит культ личности и подстраивает всю страну под себя / BELSAT, 08.07.2024: https://ru.belsat.eu/81069455/kak-lukashenko-stroit-kult-lichnosti-i-podstraivaet-vsyu-stranu-pod-sebya; Беларусский трекер перемен: Экспертные оценки, декабрь 2022 — февраль 2023 / Friedrich-Ebert-Stiftung: https://library.fes.de/pdf-files/bueros/belarus/20149-20230322.pdf

54 Ці існуе культ асобы Лукашэнкі? Разабраліся на дзесяці канкрэтных прыкладах / Зеркало, 24.01.2023: https://news.zerkalo.io/cellar/31066.html

55 Культ личности Лукашенко: в Лицее БГУ открыли таблички в его честь / MOTOLKOhelp, 30.05.2024: https://motolko.help/ru-news/kult-lichnosti-lukashenko-v-liczee-bgu-otkryli-tablichki-v-ego-chest/

56 Мониторинг трендов в системе образования Республики Беларусь за период 16.10.2023 - 22.10.2023 гг. / iSANS, 25.10.2023: https://isans.org/ru/analysis/monitoring/monitoring-trendov-v-sisteme-obrazovaniya-respubliki-belarus-za-period-16-10-2023-22-10-2023-gg.html

2 кастрычніка 2022 г. у гадавіну ўтварэння вайскова-спартовага клубу “Рысь” на тэлеканале СТВ запісалі сюжэт пра ўдзельнікаў клубу, дзе дзеці кажуць, а часам крычаць у камеру: “У нас найлепшы прэзідэнт!”, “Я буду абараняць Беларусь”, “Вораг не пройдзе”, “Спецназ – сіла, я пайду ў спецназ”, “Таварышу прэзідэнце, мы не падвядзём”, “Змагары, нават не спадзявайцеся”[57].

Фактычна “патрыятычнае выхаванне” ставіць знак роўнасці паміж радзімай і рэжымам Лукашэнкі, спрабуючы навучыць няпоўнагадовых абараняць яго ад магчымага вонкавага ўварвання і ўнутраных апанентаў.

У выніку маніторынгу захадаў у сферы адукацыі эксперты iSANS прыйшлі да высновы пра значнае ўзмацненне культу асобы Лукашэнкі ў 2022–2024 гг. у наступных кірунках.

1. Меркаванне Аляксандра Лукашэнкі вызначальнае і адзіна правільнае пры прыняцці пастановаў у сістэме адукацыі.
2. Масавае прыцягненне навучэнцаў, студэнтаў і педагогаў да прагляду захадаў з удзелам Лукашэнкі.
3. Інтэнсіфікацыя праяваў культу асобы Лукашэнкі ў адукацыйным працэсе і пазакласнай дзейнасці (у тым ліку ў дзіцячых дашкольных установах)[58].

Усенароднае публічнае адабрэнне дзейнасці Аляксандра Лукашэнкі дасягаецца праз жорсткі крымінальны пераслед за любыя негатыўныя ацэнкі ягонай асобы.

Практыка запалохвання ўвогуле ёсць важным інструментам уладаў у забеспячэнні лаяльнасці навучэнцаў і педагогаў, прыцягненні дзяцей і моладзі ў праўладныя арганізацыі. Школьнікам пагражаюць адмоўнымі характарыстыкамі, адсутнасцю магчымасцяў паступлення ў ВНУ; студэнтам – пазбаўленнем месца ў інтэрнаце, стыпендыі, адлічэннем; выкладнікам – пазбаўленнем прэміяльных выплатаў і звальненнем. Над усімі вісіць пагроза адміністратыўнага і крымінальнага пераследу за праявы іншадумства, выкарыстанне нацыянальнай сімволікі, сумленнае выкананне сваіх прафесійных абавязкаў.

У траўні 2023 г. праўладны прапагандыст публічна заявіў пра неабходнасць адбіраць дзяцей у бацькоў, нязгодных з захопам улады ў Беларусі нелегітымным прэзідэнтам[59]. У студзені 2025 г. пачала дзеяць пастанова Савету Міністраў, што дазваляе прызнаваць дзяцей бацькоў, асуджаных за распаўсюд “экстрэмісцкіх” матэрыялаў, у сацыяльна

57 «У нас самый лучший президент!», «Змагары, даже не надейтесь!» Дети из «Рыси» выпустили обращение / Зеркало, 03.10.2022: https://news.zerkalo.io/life/23150.html

58 Мониторинг трендов в системе образования Республики Беларусь за период 16.10.2023 - 22.10.2023 гг. / iSANS, 25.10.2023: https://isans.org/ru/analysis/monitoring/monitoring-trendov-v-sisteme-obrazovaniya-respubliki-belarus-za-period-16-10-2023-22-10-2023-gg.html

Культ личности Александра Лукашенко в беларусском образовании (декабрь 2023 — август 2024) / iSANS, 08.09.2024: https://isans.org/ru/education/education-analytics/kult-lichnosti-aleksandra-lukashenko-v-belarusskom-obrazovanii-dekabr-2023-avgust-2024.html

59 Дзермант, 06.05.2023: https://t.me/dzermant/5487

небяспечным становішчы[60]. Змест пастановы афіцыйна замацаваў існую практыку[61], узмацніў кантроль за вучнямі ды іхнымі бацькамі.

## Высновы

Пасля масавых пратэстаў 2020 г. рэжым Лукашэнкі пачаў укараняць элементы вайсковай падрыхтоўкі (у тым ліку навыкі абыходжання са зброяй), дысцыпліны, атрыбутыкі ў выхаванне дзяцей і моладзі. Мілітарызацыя дзяцінства – феномен, які набірае абароты ў Беларусі. Да ўдзелу ў “выхаваўчых” захадах з удзелам вайскоўцаў і вайсковай тэхнікі прыцягваюцца дзеці з трохгадовага веку.

Журналісты і праваабаронцы неаднаразова выказвалі публічны пратэст супраць масавага ўцягвання беларускіх дзяцей у сістэму вайсковых летнікаў, навучання іх вайсковай справе і казарменнай дысцыпліне[62]. У 2023 г. Міжнароднае таварыства прымірэння (IFOR) на сесіі Рады правоў чалавека ААН выказала занепакоенасць павелічэннем колькасці мілітарызаваных летнікаў у Беларусі.

Праваабарончыя арганізацыі Freedom House, Цэнтр правоў чалавека Zmina, Праваабарончы цэнтр “Вясна” абвінавацілі рэжым у знішчэнні ідэнтычнасці ўкраінскіх дзяцей, вывезеных з акупаваных Расіяй тэрыторыяў. Іх запісваюць у беларускія навучальныя ўстановы, дзе навучанне вядзецца па-расійску, а праграмы – прарасійскія. Улады прымушаюць украінскіх дзяцей наведваць праваахоўныя органы і вайсковыя часткі, сустракацца з прадстаўнікамі беларускіх вайскоўцаў і моладзевых вайсковых арганізацыяў. Падчас гэтых сустрэчаў вядзецца прапаганда ідэяў “русского мира”, наратывы якога залучаюць нянавісць да іншых нацыянальнасцяў, у тым ліку да ўкраінцаў.

З боку праваабарончых арганізацыяў прагучала прапанова да замежных урадаў і грамадзянскіх арганізацыяў заклікаць Міжнародны крымінальны суд пачаць расследаванне фактаў перамяшчэння, індактрынацыі, мілітарызацыі ўкраінскіх дзяцей лукашэнкаўскім рэжымам, выдаць ордары на арышт самаабвешчанага прэзідэнта Беларусі і чыноўнікаў сістэмы беларускай адукацыі, якія падпісваюць распараджэнні, скіраваныя на мілітарызацыю ўкраінскіх дзяцей.

---

60 Постановление Совета Министров Республики Беларусь 30 декабря 2024 г. № 1055 «О признании детей находящимися в социально опасном положении и нуждающимися в государственной защите» / Национальный правовой Интернет-портал РБ, 01.01.2025: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22401055

61 Теперь официально. Детей будут ставить в СОП, если их родителей привлекали по «политическим» статьям / Зеркало, 01.01.2025: https://news.zerkalo.io/life/87440.html

62 The International Fellowship of Reconciliation speaks at the UN on militarization of children and violations of the right to conscientious objection in Belarus / IFoR, March 22, 2023: https://www.ifor.org/news/2023/3/23/ifor-speaks-at-the-un-on-militarization-of-children-and-violations-of-the-right-to-conscientious-objection-in-belarus

Скрадзенае дзяцінства: як беларускі рэжым сцірае ідэнтычнасць украінскіх дзяцей праз перасяленне, перавыхаванне ды мілітарызацыю / Freedom House, Цэнтр па правах чалавека ZMINA, Рэгіянальны цэнтр па правах чалавека (РЦПЧ) і «Вясна», Кастрычнік 2024: https://spring96.org/files/book/be/report_dzeci_ua.pdf

От сборки автоматов до “православной войны за русских”. Как происходит милитаризация детей-сирот в Беларуси / Настоящее Время, 21.08.2024: https://www.currenttime.tv/a/militarizaciya-detei-sirot-v-belarusi/33084394.html

Протест «Нашего Дома» против вовлечения детей в милитаризацию Беларуси / Наш Дом, 2022-09-07: https://nash-dom.info/95552

Разумеючы важнасць гэтай ініцыятывы, адзначым, што аналагічнага заклiку ў дачыненні беларускіх дзяцей не прагучала. А менавіта яны – галоўны аб’ект уздзеяння рэжыму Лукашэнкі: зазнаюць мілітарызацыю, русіфікацыю, пазбаўляюцца нацыянальнай ідэнтычнасці. Беларускія дзеці павінны мець мірнае дзяцінства з забеспячэннем усіх правоў і свабодаў, замацаваных у міжнародных і рэспубліканскіх заканадаўчых актах. Злачынствы службовых асобаў, якія спрыяюць мілітарызацыі адукацыйнай прасторы Беларусі, мусяць фіксавацца для наступнага выстаўлення абвінавачванняў у Міжнародны крымінальны суд. Рэальная пагроза адказнасці за свае дзеянні можа знізіць высокі градус актыўнасці беларускіх чыноўнікаў. Мы назіраем сапраўдную гонку за колькасцю ахопленых вайскова-“патрыятычнымі” захадамі дзяцей, а таксама максімальнае набліжэнне формы захадаў да ўмоваў вайсковых падраздзяленняў.

Рэжым імкнецца ўцягнуць усіх дзяцей у сістэму вайскова-“патрыятычнага” выхавання, абапіраючыся на існую сетку дашкольных і агульнаадукацыйных установаў, а таксама загарадныя летнікі кругладзённага перабывання. Масавае закрыццё прыватных школаў увосень 2022 г. прывяло да манапалізацыі дзяржаваю сістэмы адукацыі, адсутнасці магчымасцяў атрымаць адукацыю без жахліва ціску прапаганды.

Пад выглядам патрыятычнага выхавання дзецям прышчапляюць вернасць асабіста Лукашэнку. У межах вайскова-“патрыятычных” мерапрыемстваў навучэнцам навязваецца ідэалогія “рускога мира”, сцвярджаецца законнасць так званай спецыяльнай вайсковай аперацыі ды штучна створаных ДНР і ЛНР, дапускаецца ўдзел чальцоў узброеных фармаванняў, як прыватная вайсковая кампанія “Вагнэр”, у навучальна-выхаваўчым працэсе.

Адначасова назіраецца тэндэнцыя абмежавання ўплыву бацькоў на ўдзел іхных дзяцей у вайскова-“патрыятычных” мерапрыемствах: ад недаінфармавання пра змест такіх захадаў да прызнання дзяцей бацькоў, нязгодных з дзеяннямі ўладаў, “у сацыяльна небяспечным становішчы”. Сістэма запалохвання ў школах і вышэйшых навучальных установах залучае рэгулярныя гутаркі з прадстаўнікамі сілавых структураў, выязныя суды і нават арышты беспасярэдне ў аўдыторыях.

# Высновы і рэкамендацыі

Лавіна рэпрэсіяў, якую рэжым абрушыў на жыхароў Беларусі пасля здушэння пратэстаў 2020 г., сее страх. Мэта відавочная: знішчыць магчымасць паўтору пратэснага сцэнара. Нацыянальную сімволіку спрабуюць звязаць з калабарацыянізмам часу Другой сусветнай вайны, а калабарацыяністаў прыраўноўваюць да нацыстаў. Гісторыя робіцца інструментам для абвінавачвання праціўнікаў рэжыму, стварэння “гістарычнага абгрунтавання” іхнага пераследу.

Кнігі лаўрэатаў Нобэлеўскай прэміі Святланы Алексіевіч і Ляйпцыґскай прэміі за ўнёсак у еўрапейскае ўзаемаразуменне Альгерда Бахарэвіча, творы беларускіх філосафаў, пісьменнікаў, гісторыкаў, сацыёлагаў канфіскуюць з бібліятэк, спальваюць, закопваюць бульдозерам. За іх захоўванне пагражае арышт. Ніхто дакладна не ведае, што яшчэ дазволена ў беларускім тэатры абсурду, а што ўжо не.

Празмерная жорсткасць рэпрэсіўных пастановаў, несувымернасць пакаранняў, калі падставаю для арышту робяцца белыя шкарпэткі з чырвонаю паласой, а продаж сувенірнай прадукцыі прыраўноўваецца да здрады дзяржаве, ствараюць уражанне хаосу ды бессістэмнасці. Але калі зірнуць на карціну звонку, дробныя кавалачкі складваюцца ў мазаіку. Сістэма існуе. Уважліваму назіральніку робіцца ясна, дзе для яе галоўны вораг, якія старонкі гісторыі імкнуцца “схаваць”, чые імёны – не згадваць.

1. Роля галоўнага геапалітычнага ворага сучасным кіраўніцтвам Беларусі адведзеная Польшчы. Гэта абумоўлена не толькі падтрыманнем польскім бокам праціўнікаў нелегітымнага рэжыму, але і жаданнем пазбавіць беларускую гісторыю еўрапейскага кантэксту. Праўладныя гісторыкі не лічаць больш патрэбным вылучаць гісторыю Рэчы Паспалітай у асобны перыяд. Аднабакова негатыўна трактуюць перыяд Другой Рэчы Паспалітай.  Зафіксаваныя прыклады дзяржаўнага вандалізму адносна месцаў памяці жаўнераў Войска Польскага і Арміі Краёвай. У грамадскай свядомасці замацоўваюцца даты, якія падкрэсліваюць супрацьстаянне з “польскім светам”: 17 верасня (1939) зацверджаны як Дзень народнага адзінства. Свята адзінства Беларусі з Расіяй расійскі бок прапануе адзначаць у дзень трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, 24 кастрычніка (1795).
2. У выніку русіфікацыі беларускай гістарычнай прасторы пасля 2020 г. найбольш пацярпела XIX стагоддзе. Матыў зразумелы: аўтары абноўленых навучальных дапаможнікаў імкнуцца даказаць, што ў складзе Расійскай імперыі беларусам жылося лепш, а антырасійскія паўстанні псуць гэтую карціну. Выпускнікі сучасных школаў і ўніверсітэтаў амаль нічога не ведаюць пра ўпартую антырасійскую барацьбу сваіх продкаў, якая знайшла ўвасабленне не толькі ў паўстаннях, а і ў захаванні ідэнтычнасці праз веру, адукацыю, цікавасць да гістарычнай спадчыны.

3. Ёсць імёны, згадка пра якія выклікае страх у прадстаўнікоў беларускіх уладаў: іх выдаляюць з геаграфічных мапаў, старонак дапаможнікаў, апаганьваюць месцы памяці. Найбольшы ўдар быў нанесены па рэпрэзентацыі асобы кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання Кастуся Каліноўскага і лідара нацыянальнага адраджэння Вацлава Ластоўскага. Арганізацыя канферэнцыяў, конкурсаў, кўэстаў і вандровак з мэтаю вывучэння і папулярызацыі іхнай дзейнасці – найлепшы спосаб ушанаваць памяць герояў.

У беларускіх падручніках адсутнічаюць тэмы сталінскіх рэпрэсіяў ды іх наступстваў, гісторыі беларускай эміграцыі, усебаковага аналізу падзеяў Другой сусветнай вайны. Адначасова яе гераізацыя дасягнула абсурдных памераў у беларускай адукацыйнай прасторы. Курс “Генацыд беларускага народу” рэкамендаваны з 1-га класу, а вывучэнне айчыннай гісторыі прадугледжанае з 4-га. Такім чынам, вывучэнне гісторыі пачынаецца з ваеннай тэмы, апісання карных аперацыяў і пакутаў беларускага народу.

Мілітарызацыя адукацыйнай і выхаваўчай прасторы – найбольш небяспечная тэндэнцыя ў сучаснай сістэме адукацыі. “Гульню ў вайну” спрабуюць зрабіць прывабнаю для дзяцей, пачынаючы з трохгадовага веку. Мы назіраем сапраўдную гонку за колькасцю ахопленых вайскова-“патрыятычнымі” захадамі школьнікаў, максімальнае набліжэнне формаў гэтых захадаў да дзейнасці вайсковых падраздзяленняў. Пад выглядам патрыятычнага выхавання дзецям прышчапляюць вернасць асабіста Лукашэнку, навязваюць ідэалогію “русского мира”.

Злачынствы службовых асобаў, якія спрыяюць мілітарызацыі адукацыйнай прасторы Беларусі, павінны быць зафіксаваныя для наступнага выстаўлення абвінавачанняў у Міжнародны крымінальны суд. Рэальная пагроза адказнасці за свае дзеянні можа знізіць высокі градус актыўнасці беларускіх чыноўнікаў у гэтым кірунку.

**Рэкамендацыі**

1. Феномен мілітарызацыі беларускай адукацыйнай прасторы не асэнсаваны педагагічнаю супольнасцю. Не было арганізавана канферэнцыяў, круглых сталоў, прысвечаных гэтай праблеме; не прааналізаваны змест праграмаў, паводле якіх працуюць вайскова-“патрыятычныя” летнікі, клубы і класы. Застаецца незразумелым, колькі гадзінаў штотыднёва адводзіцца ў агульнаадукацыйных установах краіны на вайскова-“патрыятычную” і ідэалагічную працу; няма публікацыяў псіхолагаў пра наступствы ўцягнення дзяцей у вайсковыя “гульні”. Гэтую працу трэба пачынаць як мага хутчэй.
2. Беларускае грамадства сутыкнулася з востраю неабходнасцю актуалізаваць паняцці:
   - каштоўнасць чалавечага жыцця безумоўная;
   - захопніцкая вайна – абсалютнае зло, якое знішчае жыццё і будучыню ўсіх яе ўдзельнікаў;

- захопніцкія войны не маюць эканамічнага сэнсу ў сучасным свеце.

Неабходна ствараць адукацыйны кантэнт для дзяцей з мэтаю фармавання сістэмы каштоўнасцяў, што ёсць асноваю нашага культурнага коду, вызначаюць беларусаў як частку еўрапейскай хрысціянскай цывілізацыі.

3. На працягу стагоддзяў Беларусь была залучаная ў еўрапейскую эканамічную, палітычную ды культурную павестку і захоўвае магчымасць яе актыўнага развіцця. Міф пра безальтэрнатыўнасць аб'яднання з Расіяй мусіць планамерна выкрывацца, ён не адпавядае заканамернасцям гістарычнага развіцця і нацыянальным інтарэсам беларусаў.
4. Неабходны чыннік фармавання нацыянальнай свядомасці беларусаў – дэкамунізацыя і дэкаланізацыя беларускай тапанімікі. Патрэбная шырокая грамадская дыскусія ў гэтых пытаннях, абмеркаванне канкрэтных варыянтаў, іх лакалізацыя, рыхтаванне гістарычных абгрунтаванняў перайменаванняў.
5. Беларуская гістарычная прастора выглядае пустэчаю. Ажывіць яе могуць гісторыі рэальных сейбітаў і ваяроў, даследнікаў і кухараў, мастакоў і музыкаў. Вяртанне суайчыннікаў у сэрцы беларусаў – задача, якая патрабуе сталай увагі. Патрыятызм выхоўваецца на канкрэтных прыкладах, а не на агульных схемах, якія дзеці засвоіць не ў стане.
6. У беларускіх падручніках няма Чалавека і асаблівасцяў ягонага паўсядзённага жыцця. Любы кантэнт, які раскрывае гэтую тэму, набліжае мінулае да сучаснасці, дазваляе беларусам адчуць сябе носьбітамі адзінага культурнага коду.
7. Гісторыя беларускай эміграцыі чакае сваіх даследнікаў, выкладнікаў і папулярызатараў. У грамадстве адсутнічае разуменне прычынаў эміграцыі, яе асноўных кірункаў, хваляў і г. д. Досвед беларускіх эмігрантаў, іхны ўнёсак у нацыянальнае адраджэнне, сусветную навуку і культуру дасюль не асэнсаваныя.
8. У беларускай адукацыйнай прасторы ідзе актыўная прапаганда ідэяў "русского мира". Адначасова ажыццяўляюцца захады для абмежавання доступу грамадзянаў да еўрапейскай адукацыі. Гэта можа прывесці да арыентацыі беларускай інтэлектуальнай эліты на Расію. Для супрацьдзеяння негатыўным тэндэнцыям важна:
    - падтрымліваць культурніцкія і адукацыйныя ініцыятывы, якія прасоўваюць беларускую мову, культуру, гісторыю;
    - пашыраць магчымасці ўдзелу беларускіх школьнікаў, студэнтаў і выкладнікаў у міжнародных адукацыйных праграмах навучання і перападрыхтоўкі; надаваць ім візавае падтрыманне.